незалежная газета

№ 24 (622) 24 чэрвеня 2009 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Заснаваная ў лістападзе 1906. Аднoўленая ў маі 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у серады



**Палітбюро-2009: Андрэй Кабякоў**

Старонка 8

**Не забудзьцеся падпісацца на паўгоддзе**

Старонка 2



**Анджаліна Джолі**

Старонка 12

## У НУМАРЫ

**Спадзяванні ўлад разбіліся аб аўтарытэт Пургурыдэса**

Беларусі не вярнулі статус спецыяльна запрошанай у Парламенцкую асамблею Рады Еўропы. **Старонка 3.**

**Гісторыя аднаго шпіёна**

Польскае следства лічыць, што беларус Сяргей Моніч працаваў не толькі на КДБ, але і на расійскія спецслужбы. **Старонка 6.**

**Іран: Таемныя спружыны рэвалюцыі**

Паўстанне ў Іране мае шанцы таму, што за ім стаяць аятолы-мільярдэры. Піша ўсходазнаўца Сяргей Богдан. **Старонка 7.**

**Ахвяры бяздарнага рэжыму**

Мінск у першыя дні вайны. Піша Алег Дзярновіч. **Старонка 13.**

**ARCHE у Маладзечне**

**2 ліпеня (чацвер) у Маладзечне (вул. Чыстая, 26)** пройдзе прэзентацыя Полацкага нумара часопіса ARCHE. Чакаецца ўдзел рэдактара Валера Булгакава, пісьменніка Уладзіміра Арлова, гісторыка Андрэя Янушкевіча і іншых аўтараў. **Пачатак у 16.30.**

«Наша Ніва» з'яўляецца ў кіёсках у Мінску ў сераду ад абеду, у рэгіёнах — у чацвер. На газету можна і падпісацца — глядзі **старонку 2**.

# Шлюб па разліку

**«Калі беларусы выберуць Еўропу, іх будуць чакаць з абдымкамі», — заявіла ў Мінску еўракамісарка Беніта Ферэра–Вальднэр. Беларусь не можа без супрацоўніцтва з Еўропай «далей развіваць эканоміку», прызнаўся Аляксандр Лукашэнка падчас сустрэчы з ёю.**



Сяргей Мартынаў і Беніта Ферэра-Вальднэр.

PHOTO.BYMEDIA.NET

Пасля сённяшніх сустрэчаў пачнуцца двухбаковыя перамовы па ўсіх канкрэтных пытаннях, з адкрыццём еўрапейскіх рынкаў для беларускіх вытворцаў уключна, заявіла еўракамісарка па замежных сувязях і палітыцы суседства Беніта Ферэра-Вальднэр перад прадстаўнікамі незалежнага грамадства і пасламі краін Еўрасаюза ў гатэлі «Еўропа». Гэты яе выступ завяршаў праграму насычанага візіту, што адбыўся 22 чэрвеня. Уранку яна спаткалася з лідэрамі апазіцыі і прадстаўнікамі грамадскасці, а пасля дзве з паловай гадзіны гаварыла з Лукашэнкам.

У сваім выступе Ферэра-Вальднэр адзначыла некалькі сімвалічных момантаў. Найперш, чыноўніца падкрэсліла, што гэта першы візіт у нашу краіну асабіста яе, і першы візіт да нас еўракамісара.

«Наша з вамі сустрэча адбываецца ў гатэлі пад назвай «Еўропа», пад сцягам Еўрасаюза. Спадзяюся, што ЗША і Расія не супраць», — сказала яна.

У сваім выступе яна нагадала, што пачынаючы з мінулага лета Беларусь і Еўропа абмяняліся надзвычай пазітыўнымі сігналамі: афіцыйны Мінск закрыў пытанне з вязнямі сумлення, на што Брусель адказаў скасаваннем санкцый супраць шэрагу чыноўнікаў.

**Працяг на старонцы 2.**



**Маршруты па Беларусі: усходні фарпост**

Старонка 11.

# Эх, раз, яшчэ раз...

**Валютны калідор павялічаны да 10%. Гэта азначае дэвальвацыю рубля яшчэ на 5%. Піша Ягор Марціновіч.**

31 снежня 2008 года. Навагодні зварот прэзідэнта Беларусі А.Лукашэнкі: «Улада не дапусціць абвалу і хаосу, не здрадзіць вашаму даверу. Мы ніколі не здрадзім свайму прынцыпу — клопаце аб чалавеку!»

Праз дзень улада заявіла пра аднаразовую 20%-ю дэвальвацыю рубля. У адзін момант насельніцтва згубіла каля мільярда даляраў. Тады ж было прынятае рашэнне: за год утвораны валютны кошык можа зменшыцца ці павялічыцца на 5%. Але не хвалюйцеся: ні кроплі больш. Усталяваная мяжа стала сімвалам цвёрдасці курсу, абранага Нацбанкам.

5 мая 2009 года. Кіраўнік Нацбанка П.Пракаповіч: «Адступленняў не будзе, перагляду калідора ў той ці іншы бок не плануецца. Для нас непрымальныя парады пра пашырэнне калідора да 15% ці правядзенне яшчэ адной дэвальвацыі».

22 чэрвеня. Нацыянальны банк раптам перадумаў. Цяпер межы валютнага калідора пашыраныя на 48 рублёў у абодва бакі. Вышэйшая дазволеная мяжа цяпер складае 1056 рублёў.

Рашэнне, агучанае галоўным банкірам краіны, было прадказальным («НН» пісала ў №21). Сапраўды, усё лагічна ішло да пашырэння калідора. І вось рашэнне агучанае. Як яго ацэньваць?

**Працяг на старонцы 4.**

# Шлюб па разліку

Працяг са старонкі 1.

Але гэтага мала, падкрэсліла высокая госця, Еўропа чакае ад Беларусі глыбейшых зменаў. Найперш, зменаў у выбарчае заканадаўства. А таксама роўных умоваў для СМІ і свабоду сходаў і выказванняў для прадстаўнікоў палітычных партый і незалежнага грамадства. Гэтая думка была скіраваная да рэдактараў незалежных СМІ, што прысутнічалі на сустрэчы, а таксама да лідэраў палітычных партый і прадстаўнікоў грамадскасці.

Асноўную частку выступу спадарыні Беніты заняла тэма «Усходняга партнёрства». Яна падзякавала пасланніку Чэхіі, у часе старшынства якой у ЕС было падпісанае пагадненне. Пры гэтым еўрапейская чыноўніца нагадала і пра сваю ролю ў гэтым праекце: «Я, калі дазволіце, маці «Усходняга партнёрства».

Прысутным нагадалі пра тое, што Беларусь можа атрымаць у рамках праграмы: аблягчэнне візавага рэжыму (магчымае скарачэнне яе цаны найперш), выхад беларускіх вытворцаў на еўрапейскі рынак, дыверсіфікацыя эканамічнага курсу краіны і г.д.

Еўракамісарка нагадала, што ў снежні скончаецца перыяд прыпынення візавых санкцый супраць беларускіх чыноўнікаў, па выніках чаго будуць ацэненыя новыя крокі беларускага боку.

Што датычыць А.Лукашэнкі, то яго высокая госця з Еўропы натхніла на паэтычны стыль. Такой канцэнтрацыі метафар, што прагучала з яго вуснаў на сустрэчы з еўракамісаркай, могуць пазайздросціць нават аўтары лірычных санетаў.

Ён казаў пра белую кашулю дыпламата (на якую не прэтэндуе, але затое — шчыры); пра мост між Захадам і Усходам; пра нафтавыя, газавыя ды транспартныя артэрыі, што пралеглі цераз нашу краіну; пра двух монстраў — Расію і Еўрасаюз, з якімі трэба адначасна знаходзіць супольную мову. І нарэшце прапанаваў... сэрца. Беларусь — сэрца Еўропы.

Паэзія, зрэшты, ішла поруч з прагматызмам. Паводле Лукашэнкі, Беларусь не можа без супрацоўніцтва з Еўропай «далей развіваць эканоміку». Апроч таго, «фінансавыя рэсурсы, крэдытаванне, фінансаванне — таксама для нас найважнейшы фактар».

Госця таксама дэманстравала сімвалы прагматызму: ужо не 12 патрабаванняў, а толькі «шэраг просьбаў», не ўсе з якіх, маўляў, яшчэ выкананы. Спадарыню Вальднэр усцешыла, што гаспадар сустрэчы «вельмі ўважліва прыслухаўся да таго, што я казала». З яе словаў, Беларусі трэба «даць час» для рэформаў і пры гэтым «настроіцца пазітыўна».

Госця абмянялася з міністрам замежных справаў Мартынавым тэкстамі мемарандуму аб узаемаразуменні ў галіне энергетыкі ды прывезла ў Мінск 10 мільёнаў еўра на прадуктовыя праграмы. Беларусі абяцаюць расчыніць еўрапейскія рынкі.

Візіт Ферэра-Вальднэр наклаўся на фон нядаўняй малочнай вайны з Расіяй, якую Мінск выйграў. Лукашэнка не прамінуў празрыста намякнуць: Еўрасаюзу варта ўлічыць, як заўзята беларускае начальства бароніць суверэнітэт ад імперыі. «Чаго мы хочам ад Еўропы? Каб еўрапейцы разумелі, што ... тут існуе незалежная суверэнная дзяржава, і замахвацца на гэта, як бы камусьці ні хацелася, мы дазволіць не можам».

«Калі беларусы выберуць Еўропу, іх будуць чакаць з раскрытымі абдымкамі. У вас ёсць усе магчымасці, і я думаю, вы іх скарыстаеце», — заявіла Вальднэр на сустрэчы ў «Еўропе». Няма сумневу, што тое самае яна казала Лукашэнку сам-насам.

**Сямён Печанко, Аляксандр Класкоўскі**

## «Еўропу» ахоўвалі людзі ў трэніках

Так і хочацца заклікаць: апраніце нашыя спецслужбы па-еўрапейску!

Перад пачаткам сустрэчы еўракамісара Беніты Ферэра-Вальднэр з грамадскасцю перад гатэлем «Еўропа» дзяжурылі некалькі мікрааўтобусаў і легкавікоў з прадстаўнікамі спецслужбаў. На выхадзе па сканчэнні сустрэчы побач з парадным уваходам гасцей мерапрыемства свідравалі калючымі позіркамі некалькі моцных дзецюкоў з дратамі у вушах.

Апранутыя яны былі у спартовыя касцюмы, адзін — у ярка-чырвоны гарнітур.

Хочацца спадзявацца, што такія сустрэчы стануць частымі і ўсё прыйдзе з карысным вопытам. А пакуль так і хочацца заклікаць: апраніце нашыя спецслужбы па-еўрапейску!

**Сямён Печанко**

### СЦІСЛА

#### Лукашэнка рыхтуецца да нафтавага канфлікту?

23 чэрвеня ён правёў нараду па пытаннях пастаўкі і перапрацоўкі нафты. Ён даручыў ураду і Адміністрацыі прэзідэнта да канца III квартала прапрацаваць усе праблемныя тэхнічныя пытанні паставак і перапрацоўкі нафты ў Беларусі, а таксама вызначыцца са спісам пастаўшчыкоў нафты ў нашу краіну. На нарадзе прысутнічалі прадстаўнікі расійскіх нафтавых кампаній.

#### У Мінску пабудуюць трэцяе кольцо

Меркаваная трасіроўка трэцяга кальца наступная: вул.Філімонава — зялёная зона з выхадам на вул.Алешава — працяг вул.Шырокай — участак на поўнач ад птушкафабрыкі імя Крупскай — перакрыжаванне Свіслачы з выхадам на Вясёлкавую — вул. Глебкі — Цімашэнкі — Шаранговіча — Гарэцкага — Алібегава і яе працяг з паўднёвага боку аэрапорта «Мінск-1» — перакрыжаванне чыгункі ў Магілёўскім кірунку і ракі Свіслач — вул.Малініна і яе працяг — Кабушкіна — Радыяльная.

#### Супертанныя ягады ў Мінску

Клубніцы на Камароўцы каштуюць 3500—4000 за кг. Пагадзіцеся — зусім танна для такіх карысных, духмяных ягадаў. Чарэшні беларускай на прылаўках пакуль няма. Толькі горы малдаўскай і ўзбекскай — ад 6000 за кг.

**НШ, СМ; БелаПАН**


# Падпішыся на другое паўгоддзе!

**Падпісацца можна праз Рэдакцыю і праз «Белпошту». Мы рэкамендуем — праз Рэдакцыю**

Цана падпіскі праз Рэдакцыю на месяц складае **6000 рублёў**.

Наша сістэма дастаўкі газеты за 3 гады даказала сваю надзейнасць. Усе тыя, каго такі спосаб атрымання газеты задавальняе, хай застаюцца вернымі такой падпісцы.

Мы зможам дастаўляць Вам газету хутчэй або з той жа хуткасцю, што «Белпошта».

Падпісныя індэксы ў каталогу «Белпошты»: для людзей — **63125**, для прадпрыемстваў — **631252**. Падпісацца можна на кожнай пошце. Цана гэтай падпіскі — 8 520 руб. на месяц.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764

| Рахунак атрымальніка | 3012 206 280 014 | Асабовы рахунак | |
|---|---|---|---|

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газету "Наша Ніва" | | | | | |

Агулам

Касір

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764

| Рахунак атрымальніка | 3012 206 280 014 | Асабовы рахунак | |
|---|---|---|---|

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газету "Наша Ніва" | | | | | |

КВІТАНЦЫЯ

Агулам

Касір М.П.

**Каб штотыдзень атрымліваць газету,**

дасылайце адрасы і грошы за газету. Кошт на месяц — 6 тыс. рублёў.

1) Просім усіх ахвотных чытаць газету **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Мінск, а/с 537.

2) **Просім у бланку банкаўскага паведамлення ці паштовага пераказу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.**


# Дзякуй за ахвяраванні

**Мікалаю К., Сяргею В.** з Новапалацкага раёна.
**А.Р., А.Г.** з Мастоўскага раёна.
**С.Т.** з Докшыцкага раёна.
**Леакадзіі Н., Анне Р., Вікенцію С.** з Валожынскага раёна.
**Ю.А.** з Уздзенскага раёна.
**Мікалаю Б.** з Глыбоцкага раёна.
**В.Б.** са Светлагорскага раёна.
**А.Г., Уладзіміру Ц.** з Лагойскага раёна.
**Д.С., А.Ф.** з Гродна.
**Івану К.** з Кобрынскага раёна.
**Віктару К., Міхаілу К.** з Рэчыцкага раёна.
**Сяргею Х., Вользе Б.** са Столінскага раёна.
**Віталю Г.** з Чачэрскага раёна.
**Сяргею Ж.** з Клецкага раёна.

# Спадзяванні ўлад разбіліся аб аўтарытэт Пургурыдэса

**Беларусі не вярнулі статус спецыяльна запрошанай у Парламенцкую асамблею Рады Еўропы. Дэпутаты ўхвалілі даклад Андрэа Рыгоні, але з істотнай папраўкай.**

У праграму летняй сесіі Парламенцкай асамблеі Рады Еўропы недзе паміж выбарамі члена Еўрапейскага суда па правах чалавека ад Сан-Марына і пасяджэннем спецыяльнага трыбунала па Лівану, уткнулася і беларускае пытанне. Дэпутаты павінны былі заслухаць спецдакладчыка па Беларусі італьянца Андрэа Рыгоні **(на фота)** і пасля спрэчак прагаласаваць аб вяртанні палаце прадстаўнікоў статусу спецыяльна запрошанага ў ПАРЕ.


PHOTOBYMEDIA.NET

У пачатку 1990-х Беларусь ужо мела гэты статус, але пасля рэферэндуму 1996 года была яго пазбаўленая. Сёння перад будынкам Парламенцкай асамблеі ў Страсбургу лунаюць 47 сцягоў еўрапейскіх краін. Няма толькі аднаго — беларускага.

Зрэшты, на гэты раз афіцыйны Мінск быў настроены пазітыўна. Амаль ні ў каго не было сумневаў, што статус спецыяльна запрошанага будзе адноўлены.

Тым не менш, адпраўляць у Страсбург спікера палаты прадстаўнікоў Уладзіміра Андрэйчанку ўлады не адважыліся. Палічылі, што будзе шмат нязручных пытанняў. Нягожа такому высокаму чыноўніку адчуваць разгубленасць . Адправілі ягонага намесніка спадара Іванова, былога старшыню Шклоўскага райвыканкама. Хай ён выкручваецца.

Апазіцыю ж у Эльзас паехаў прадстаўляць лідэр АГП Анатоль Лябедзька — прынцып парытэту.

У ПАРЕ існуюць два пункты гледжання на праблему. Першы вектар прадстаўляе Андрэа Рыгоні, які лічыць, што блакаду з Беларусі трэба здымаць, шукаць кантактаў з уладамі. Іншую цвёрдую пазіцыю ўвасабляе папярэднік Рыгоні, кіпрскі дэпутат Хрыстас Пургурыдэс, знакаміты сваім мемарандумам па зніклых палітыках. Абодва гэтыя дэпутаты павінны былі выступаць у аўторак. Чыя лінія возьме?

> **Рыгоні: «Лепшыя часы ў Беларусі могуць пачацца праз 30—40 гадоў. Я, магчыма, і дажыву, а вось мой калега Пургурыдэс — наўрад ці».**

Рыгоні пачаў пераконваць, што палітыка ізаляцыі не прынесла ніякага плёну. У якасці прыкладу станоўчых перамен ён назваў вызваленне дзевяці палітзняволеных, легалізацыю трох газет, стварэнне кансультацыйных радаў з удзелам апазіцыі. «Прапаную аднавіць статус спецзапрошанага», — была яго адназначная выснова.

Але тут слова ўзяў Пургурыдэс і адразу пачаў рэзаць праўду-матку. Маўляў, парламент беларускі цалкам пад кантролем Лукашэнкі, апазіцыі там няма, апаненты рэжыму па-ранейшаму знаходзяцца за кратамі. О'кей, камітэт палітычных справаў ПАРЕ не супраць прапановы Рыгоні, казаў ён, але з адной умовай — няхай Беларусь увядзе мараторый на смяротнае пакаранне. Выступ Пургурыдэса сарваў воплескі.

Групы лібералаў, сацыялістаў, дэмакратаў, народнікаў, у прынцыпе, падтрымалі даклад Рыгоні. Нечакана, што адзінымі, хто з песімізмам паставіўся да даклада, быў Аляксей Лотман ад Аб'яднаных левых (камуністы і левыя). Сітуацыю ў Беларусі ён назваў «сціплым прагрэсам». «Не губляйце пільнасць», — звярнуўся Лотман да калег.

Толькі потым слова далі Валерыю Іванову. Гэты чалавек з сівымі скронямі заўважна хваляваўся. Нават не ўстаў, калі пачаў прамаўляць. Кажуць, што гэта ледзьве не першы падобны выпадак за гісторыю ПАРЕ. Гаварыў па-расійску, але з цвёрдым беларускім «ч».

Цікава, што ён прыводзіў прыклады дэмакратызацыі тыя ж, што і Рыгоні, адзін у адзін. Праўда, вязняў сумленняназваць такімі не наважыўся. Абмежаваўся фразай «асобы, якіх ПАРЕ лічыць палітвязнямі». «Спадзяюся, што сённяшняе рашэнне будзе накіраванае ў будучыню», — сказаў Іваноў.

Анатоль Лябедзька выступаў эмацыйна. «Спадары дэпутаты, вы кажаце пра ізаляцыю, але гэта не ізаляцыя, а самаізаляцыя», — пачаў палітык свой выступ. Ён быў першым, хто ўзгадаў справу Аўтуховіча. Звяртаючыся да групы сацыялістаў, Лябедзька сказаў: «Як вы будзеце сябе адчуваць, калі чалавек памрэ ў турме?»

Пры канцы дыскусій слова зноў узяў Рыгоні, які крыху з'едліва адзначыў: калі працягваць чакаць, то дэмакратычныя перамены ў Беларусь могуць прыйсці і праз 30—40 гадоў. «Я, магчыма, і дажыву да гэтай пары, а вось мой калега Пургурыдэс наўрад ці», — іранізаваў Рыгоні.

Тым не менш, прапанова Пургурыдэса: спачатку мараторый, а пасля — статус, была падтрыманая амаль адзінагалосна. Толькі два чалавекі былі супраць, столькі ж устрымалася.

Рашэнне было сустрэтае нерazумennem — на тварах дзяржаўных журналістаў. Іваноў таксама быў разгублены. «Я не чакаў такога рашэння», — прызнаўся ён. На пытанне, дык будзе ўведзены мараторый ці не, віцэ-спікер пачаў казаць нешта няўцямнае пра тое, што гэта воля народу, быў рэферэндум. Доўга пагаварыць з прэсай Іванову не далі, ягоны апякун з афіцыйнай дэлегацыі ўвесь час торгаў дэпутата: «Хопіць ужо, нам пара».

Потым я падышоў да Лябедзькі. «Задаволены рашэннем, Анатоль Уладзіміравіч?» «Адмена смяротнага пакарання — гэта добра. Але лепш бы гэтай умовай былі справядлівыя выбары».

**Зміцер Панкавец, Страсбург**

## У адным самалёце ляцелі Макей, Філарэт і Саннікаў

Незвычайная кампанія сабралася на рэйсе Мінск—Франкфурт у нядзелю. На борце «Люфтганзы» ляцелі кіраўнік Адміністрацыі прэзідэнта Уладзімір Макей, мітрапаліт Філарэт і каардынатар Хартыі-97 Андрэй Саннікаў. Відома, не разам.

Уладыка Філарэт прыляцеў у Франкфурт на чатыры дні «ў госці да сяброў».

Саннікаў накіроўваўся з працоўнай паездкай у Вашынгтон.

Макей жа выправіўся ў канцлагер Дахаў. Разам з чыноўнікамі Баварыі Марцін Ноймайер 22 чэрвеня адкрылі на тэрыторыі былога канцэнтрацыйнага лагера Дахаў мемарыяльную шыльду.

**ЗП, Франкфурт-на-Майне**

## «КоммерсантЪ-Власть» падняў пальчатку, кінутую «Советской Белоруссией»

Расійскі штотыднёвы аналітычны часопіс выйшаў з фотаздымкам А.Лукашэнкі на вокладцы і прысвяціў нумар «малочнай вайне». У тым ліку ён перадрукаваў артыкул «Советской Белоруссии» «Страшная» помста» і суправадзіў яго рэдакцыйным каментаром. У каментары гаворыцца, што пад псеўданімам Павел Старадуб (аўтар «Страшнай» помсты») хаваецца галоўны рэдактар «Советской Белоруссии» Павел Якубовіч. «Павел Якубовіч, які бярэцца за пяро толькі ў выключна важных выпадках, таксама падпісвае свае злабадзённыя артыкулы псеўданімамі Сігізмунд Пушысты і Ксенафонт Суперфасфатаў. Пад апошнім імем 6 сакавіка гэтага года ў «Советской Белоруссии» выйшаў артыкул «Шмат у нас дзіковінаў, кожны дзівак — Бетховен», — сцвярджае выданне і нагадвае, што пасля таго артыкула пайшла з жыцця адна з фігурантак таго фельетона — салігорская праваабаронца Яня Палякова.

**СП**

## КДБ адклікаў пазоў аб экстрэмізме «ARCHE»

Пра гэта паведаміў адвакат выдання Павал Сапелка, якому патэлефанавала суддзя Тацяна Ласковіч.

Упраўленне Камітэта дзяржаўнай бяспекі па Брэсцкай вобласці адправіла адмову на раней пададзеную заяву аб экстрэмісцкіх матэрыялах «ARCHE». Адваката праінфармавала пра тое суддзя Тацяна Міранюк. Яна паведаміла, што КДБ адмаўляецца ад сваёй заявы, і 25 чэрвеня адбудзецца тэхнічнае пасяджэнне, на якім «нават не канечне прысутнічаць».

«Шмат што пакуль незразумела, — кажа рэдактар «ARCHE» Валер Булгакаў. — Ці значыць адкліканне заявы нашу канчатковую перамогу? І ці не спроба гэта прыспаць нашу пільнасць? Цана пытання не адзін мільён беларускіх рублёў, бо судовая справа цягнецца ўжо больш за паўгода. Для нас важна, які бок будзе плаціць судовыя выдаткі».

У кастрычніку мінулага года на беларуска-польскай мяжы мытнікі канфіскавалі 10 асобнікаў таўшчэзнага (1100 старонак) нумара часопіса.

25 лютага суд Маскоўскага раёна Брэста задаволіў заяву Упраўлення КДБ, аднак 7 мая абласны суд у парадку касацыі справу вярнуў на перасуд.

28 мая — у дзень падпісання «Усходняга партнёрства» — па просьбе КДБ суд перанеслі, а матэрыялы накіравалі на экспертызу ў Інстытут нацыянальнай бяспекі і Інфармацыйна-аналітычны цэнтр пры Адміністрацыі прэзідэнта.

У выніку павышанай цікавасці да канфіскаванага нумара тыраж яго разышоўся імгненна, і часопіс разглядае пытанне пра дадрук.

**Настасся Шамрэй**

# Эх, раз, яшчэ раз...

Працяг са старонкі 1.

### Плюсы

Галоўны плюс рашэння — стварэнне магчымасцяў для манеўра пры фармаванні курсаў валют.

Раней Нацбанк павінен быў траціць нацыянальныя валютныя рэзервы, каб не выйсці за ўсталяваны калідор.

Пашырэнне калідора — выкананне просьбаў Міжнароднага валютнага фонду, які ўжо паспеў ухваліць дзеянні беларускага боку. Значыцца, краіна можа разлічваць на дадатковы мільярд даляраў крэдыту ад Фонду.

Пэўную дадатковую палёгку займеюць экспарцёры.

### Мінусы

Давер да фінансавай палітыкі дзяржавы зноў падарваны. Рашэнне Нацбанка заканамерна выкліча новы адплыў сродкаў з рублёвых рахункаў: хто ж будзе чакаць, што ягоныя ашчаджэнні зняцэняцца яшчэ на 5% у самай блізкай перспектыве.

Варта ўлічваць, што, пры змяненні калідора валютнага кошыка за паўгода агулам на 5%, курс даляра за той самы час вырас на 7,7%, а еўра — 7,1%. Такім чынам, яшчэ 5% дэвальвацыі рубля могуць даць агульны рост амерыканскай валюты са студзеня на 10—15%, а ад верасня — на 35%. Даляр мае дасягнуць узроўню 3000 рублёў. Еўра ж, калі падрасце, то прыкладна да 4100—4200 рублёў.

### Выбар стратэгіі

Як надоўга хопіць пашыранага валютнага калідора уладам, пытанне з пытанняў.

«Усё будзе залежаць ад дзеянняў беларускага урада. Напрыклад, Латвія не праводзіла дэвальвацыю, але паменшыла вытворчасць і скараціла занятасць насельніцтва. У выніку баланс замежнага гандлю быў дасягнуты, — прыводзіць прыклад эканаміст даследчага цэнтра ІПМ Аляксандр Чубрык. — Украіна дэвальвавала грыўню, і экспарт з імпартам падраўняліся. Беларусь не скарачала вытворчасць, а невялікая дэвальвацыя праблемы дэфіцыту валюты не вырашыла.

Калі цяперашняй дэвальвацыі не хопіць для лячэння эканомікі, то і пашыранага валютнага калідора не хопіць і на два наступныя кварталы».

### Што наступнага зробіць Нацбанк?

У першы дзень пасля прыняцця рашэння курс валют не скочыў імгненна ўверх.

22 чэрвеня 2009. Нацыянальны банк: «...змены калідора будуць адбывацца плаўна, без прымянення значных разавых карэкціровак».

Пётр Пракаповіч спрабуе супакоіць грамадства. З той самай упэўненасцю, што і месяц таму, ён раздае чарговыя абяцанкі: «Мінімум месяц сітуацыя з курсам рубля змяняцца не будзе».

# Перадапошнія сярод суседзяў

Белстат падлічыў, які заробак быў налічаны сярэднестатыстычнаму беларусу ў маі.

Аказалася, што сярэдні заробак склаў 979 тысяч беларускіх рублёў (343 даляры ў эквіваленце).

Самым багатым у Беларусі, як заўсёды, стаў Мінск. У сталіцы ў сярэднім атрымліваюць 1 мільён 295 тысяч рублёў (455 даляраў).

Па ўсёй Расіі сярэднія лічбы склалі 18190 расійскіх рублёў (582 даляры). А вось у Маскве гэты паказальнік падбіраецца да мяжы ў тысячу даляраў. Зараз – 960 даляраў.

Паўднёвыя суседзі-украінцы атрымліваюць 1872 грыўні (245 даляраў), але разрыў у заробках між сталіцай і рэгіёнамі ў іх агромністы, як і ў Расіі. Кіяўляне зарабляюць у сярэднім 419 даляраў.

У суседзяў, якія ўжо апынуліся ў Еўрасаюзе, заробкі нашмат вышэйшыя. Тым не менш, фінансавы крызіс у Латвіі і Літве і аслабленне мясцовай валюты ў Польшчы прывялі да таго, што сярэднія заробкі ва ўсіх трох краінах аказаліся ніжэйшымі за тысячу даляраў. У Літве ў сярэднім плацяць 2193 літы (880 даляраў), у Латвіі 469 лат (932 даляры), а ў Польшчы 3241 злоты (991 даляр).




Варта ўлічваць, што ва ўсіх краінах ацэньваецца заробак — «брута» — да выплаты падаткаў.

**Ягор Марціновіч**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Вакол Мірскага замка працягваюць узводзіць плот і класці плітку. З іх дапамогай помнік любой эпохі можна пеператварыць у помнік нашай эпохі.**

## СЦІСЛА

### Вадкая валюта зноў падаражала

З 19 чэрвеня цэны на гарэлку павялічыліся на 2,5%. Цяпер бутэлька будзе каштаваць 7080 беларускіх рублёў.

### Нерухомасць у Кіеве патаннела ў 2,5 разу за 9 месяцаў

У верасні 2008 года сярэдняя цана квадратнага метра складала 3630 даляраў. Цяпер апусцілася да 1500 і працягвае таннець.

У выніку цана кватэр і дамоў у Кіеве практычна зраўнялася з мінскай. У сталіцы Беларусі нерухомасць за той самы прамежак часу патаннела з 1900 да 1400 даляраў за квадратны метр, або на 27%. Грыўня дэвальвавалася мацней за рубель, што моцна ўдарыла па ўзроўні жыцця ўкраінцаў.

### Кожнае чацвёртае прадпрыемства – стратнае

Паводле звестак Белстата, у студзені-красавіку 23,2% беларускіх прадпрыемстваў спрацавалі са стратамі. Агульныя іх страты склалі $175 млн – гэта ў 5,4 разу больш, чым год таму.

### Заводы прастойваюць

Колькасць пераведзеных на працу з няпоўным працоўным днём па ініцыятыве наймальніка склала 97,7 тысяч. У параўнанні з мінулым годам гэта ў 5,3 разу больш. Яшчэ 92 тысячы працаўнікоў знаходзяцца ў вымушаным адпачынку.

### Літва ў крызісе

МВФ прагназуе падзенне ВУП Літвы ў гэтым годзе на 16%, а ў 2010 – на 4%. Ухваляецца абраны ўрадам курс антыкрызісных мераў. Урад павялічвае ПДВ, павышае ўзрост выхаду на пенсію, скарачае сацыяльную дапамогу.

### «КАМАЗ» спыняе працу

Недахоп заказаў прывёў да спынення канвеера ў галоўных канкурэнтаў МАЗа. Перапынак у працы стане ўжо шостым з пачатку гэтага года. Вытворчасць узновіцца ў ліпені.

### Расія дасць Малдове крэдыт на $500 мільёнаў

Напярэдадні парламенцкіх перавыбараў у краіне МВФ у крэдыце адмовіў да часу сфармавання новага ўрада, а Крэмль выдзеліў шчодрыя грошы.

### «Беларусбанк» хоча набыць банк у Маскве

Сума куплі складзе не менш за 5 мільёнаў даляраў. Банк стане платформай для далейшага прасоўвання на расійскі рынак і дапаможа беларускім прадпрыемствам, якія пастаўляюць сваю прадукцыю на расійскі рынак.

**ЯМ**

## ЦЫТАТЫ

### Дэнамінацыі стопрацэнтна не будзе

Анатоль Драздоў, начальнік упраўлення інфармацыі Нацбанка: «Дэнамінацыі, якой усе так баяцца, стопрацэнтна не будзе ў гэтым годзе, ды і ў наступным наўрад ці».

# Твітэр-рэвалюцыі

Высокія тэхналогіі і сацыяльныя сеткі ўсё болей пранікаюць у жыццё людзей і адыгрываюць у ім вызначальныя ролі. Цяпер у іх гонар называюць цэлыя рэвалюцыі. Апошнія падзеі ў Іране і Малдове прынята называць «твітэр-рэвалюцыямі». Twitter — гэта сістэма мініблогаў (інтэрнэт-дзённікаў), якая з'явілася ў ліпені 2006-га, то бок праз некалькі месяцаў пасля прэзідэнцкіх выбараў у Беларусі.

Сама назва «твітэр» ідзе ад англійскага «шчабятаць», «ціўкаць». Гэта бясплатная сацыяльная сетка, кшталту ЖЖ. Галоўнае адрозненне твітэру ў тым, што гэтая сістэма дазваляе пакінуць толькі кароткае тэкставае паведамленне да 140 знакаў, як у смс-цы. Запосціць фотку ці напісаць разгорнуты каментар твітэр не дазваляе.

Гэтая сацыяльная сетка ствралася амерыканцам Джонам Дорсі з адзінай мэтай — даведацца, што у дадзены момант робяць ягоныя сябры. Сістэма набыла вялікую папулярнасць у свеце і робіцца ўсё больш папулярнай і ў Беларусі.

Паведамленні ў твітэры адразу з'яўляюцца ў дзённіку і імгненна прыходзяць чалавеку, падпісанаму на іх атрыманне. Прычым дастаўка можа адбывацца як праз сайт твітэру, так і праз смс, рсс-стужкі, электронную пошту.

Упершыню грамадскае значэнне твітэру было нададзенае ў красавіку летась, калі амерыканскі студэнт Джэймс Бак быў затрыманы ў Егіпце падчас фатаграфавання антыўрадавых выступаў. Па дарозе ў пастарунак праз тэлефон хлопец паспеў напісаць у дзённік адно слова: «Арыштаваны». Яно прыйшло да сяброў, якія надалі справе міжнародны розгалас. У выніку Бак праз суткі быў вызвалены.

**Сістэма твітэру распаўсюдзілася ў свеце і становіцца ўсё больш папулярнай і ў Беларусі.**

Вялікую ролю твітэр адыграў падчас нядаўніх падзеяў у Малдове. Арганізатары вулічных акцый у Кішынёве выкарыстоўвалі твітэр для хуткага інфармавання сяброў пра падзеі на вуліцах. Для хутчэйшага знаходжання ў інтэрнэце такіх пастоў яны прыдумалі адмысловы тэг (ключавое слова) #pman — гэта скарачэнне ад Piata Marii Adunari Nationale, румынская назва галоўнай плошчы Кішынёва. Паведамленні пад гэтым тэгам былі самымі папулярнымі і абмяркоўванымі.

Таксама пратэстоўцы актыўна выкарыстоўвалі сайт imarin.net для выкладвання відэа і Facebook — для фота. Улады хутка зразумелі, якімі метадамі карыстаюцца іх праціўнікі, і пастараліся лакалізаваць працу мабільных аператараў у раёнах пратэсту, а таксама абмежаваць доступ да інтэрнэту.

Фэйсбук і твітэр выкарыстоўвалі ў выбарчай кампаніі і паплечнікі іранскага апазіцыйнага палітыка Хасэйна Мусаві. Доступ да гэтых сайтаў быў заблакаваны яшчэ да выбараў, але праз пару дзён разблакаваны. У другі раз абмежавалі доступ да твітэру іранцам пасля прэзідэнцкіх выбараў.

Тым не менш, паведамленні пад тэгам #Iran elections працягвалі з'яўляцца ў інтэрнэце, праз проксі-серверы абыходзячы глушылкі. Пасля забароны замежным журналістам перадаваць з месца падзеяў, твітэры сталі ледзьве не галоўнай крыніцай інфармацыі. З іх дапамогай апазіцыянеры дамаўляліся і пра наступныя акцыі пратэсту.

Дайшло да таго, што ў адзін з гарачых дзён у Тэгеране Дзярждэпартамент ЗША быў вымушаны прасіць кіраўніцтва Твітэру адмяніць прафілактычныя працы, праз якія сайт не адчыняўся.

Твітэр гэтак моцна пашыраны менавіта ў небагатых краінах, бо гэта эканомна і нядорага. Зрабіць запіс можна са звычайнага мабільніка. У Беларусі мабільны інтэрнэт таксама ўжо даступны.

**Зміцер Панкавец**

**Дынаміка колькасці допісаў пра Іран у твітэры**




**Дынаміка колькасці допісаў пра выбары ў Іране ў твітэры**




# «Новыя СМІ» — справа ўсенародная

Інтэрнэт дазваляе кожнай хатняй гаспадыні расказаць, што пірог падгарэў, і пачуць ў адказ водгукі з усяго свету пра яе здольнасці да кулінарыі. Інтэрнэт становіцца таксама прыладай палітычнай агітацыі і сродкам атрымання інфармацыі з любой кропкі планеты, нават з дыктатарскіх краін.

Для Ірана сусветнае павуціннe стала адзінай магчымасцю расказаць пра сябе свету. У той час, калі журналістам забаранілі працаваць на тэрыторыі Тэгерана, іранцы скарысталіся сваёй інтэрнэт-магчымасцю напоўніцу. Facebook, Twitter, Youtube, Flickr і тысячы блогаў штодзень адлюстроўвалі навіны хваляванняў у Іране.

Што такое гэтыя «новыя медыі»? І як гэта было з Іранам?



**Забойства 27-гадовай Нэды, удзельніцы дэманстрацыі пратэсту ў Іране, увесь свет пабачыў праз Youtube.**

### Youtube

Youtube – гэта бясплатны анлайн-рэсурс для працы з відэа, на якім можна размясціць ці праглядзець любы відэаматэрыял, запампаваны на сайт. Ю-туб можа зрабіць вас папулярным імгненна. У гісторыю ўвайшло відэа з выступам 47-гадовай Сьюзэн Бойл, якая праспявала на тэлешоу Britain's Got Talent (аналаг расійскай «Хвіліны славы»). Па дадзеных фірмы Visible Measures, ролік праглядзелі 85,2 мільёна разоў, прычым 20 мільёнаў — за першыя двое сутак.

Youtube апраўдвае прымаўку: лепш адзін раз пабачыць, чым сто разоў пачуць. І насамрэч відэа, знятае на непрафесійныя камеры і тэлефоны, здзіўляе сваім кантэнтам (зместам). Іранскія падзеі ажываюць на вачах. Тысячы людзей на вуліцах Тэгерана пратэстуюць супраць вынікаў выбараў. Спецназаўцы-басіджы б'юць людзей. Параненыя і забітыя дэманстранты буйным планам. А таксама выступы апазіцыйных лідэраў з прамовамі і заклікамі «не саступаць».

Там, дзе тэлебачанне не паказвае аб'ектыўнай інфармацыі, а журналісты не могуць працаваць, нішу запаўняюць відэаапаратаматары. Больш за 50 ролікаў з іранскімі падзеямі, знятых найпрасцейшымі лічбавымі відэа- і фотакамерамі і нават мабільнікамі, трапілі на Ю-туб, іх праглядзелі мільёны людзей, сотні адкаментавалі на розных мовах свету.

### Flickr

Flickr — сервіс, прызначаны для захоўвання і наступнага выкарыстання сваіх лічбавых фота- і відэаролікаў. З'яўляецца адным з першых Web 2.0 сервісаў. Адзін з самых папулярных сайтаў сярод блогераў для размяшчэння фотаздымкаў. Яшчэ 4 лістапада 2008 г. на сервіс быў загружаны 3-мільярдны малюнак.

Драматычныя фотаздымкі з пратэстаў на вуліцах Тэгерана можна знайсці па запыце «Iran» на старонках Флікеру. Аднак фотаздымкаў няшмат. З прычыны абмежавання хуткасцяў інтэрнэту ў Іране загрузка аднаго фота займае гадзіну. А доступ да некаторых сайтаў і ўвогуле заблакаваны. Таму выявы падзеяў у Тэгеране трэба па крупінках шукаць на Флікеры, а таксама на падобным фотарэсурсе Picasa, фотаблогу Tehran24 ды сайце Report.com.

Мусім папярэдзіць: акрамя трафіку, фота з Ірана патрабуюць яшчэ і моцных нерваў. Бо немагчыма заставацца спакойным пасля прагляду выяваў забітай іранскай дзяўчыны ці параненых паўстанцаў.

### Facebook

Facebook – вебсайт папулярнай сацыяльнай сеткі. Гэта тыпу шырока вядомых у Беларусі аднакласнікаў, але сусветны.

Сайт быў адкрыты 4 лютага 2004 г. Маркам Цукербергам. На працягу чатырох гадоў звычайны партал універсітэта стаўся любімым інтэрнэт-адрасам для мільёнаў зарэгістраваных карыстальнікаў. У канцы снежня 2008 г. на сайце было зарэгістравана болей за 80 млн актыўных удзельнікаў, і колькасць падпісчыкаў увесь час расце.

Адлюстраванне іранскіх падзей у Фэйсбуку набыло своеасаблівы характар. Акрамя асобных груп па інтарэсах і абмеркаванні падзеяў, здымкаў і відэа, на старонках Фэйсбук праходзіць акцыя ў падтрымку іранскай апазіцыі. Некалькі соцень карыстальнікаў змянілі свае аватаркі (фотаздымкі) на зялёны колер, сімвал іранскага пратэсту.

Ёсць у Facebook — дэмакратыя — і група ў падтрымку прэзідэнта Ахмадзінеджада, якая хваліць афіцыйную палітыку краіны. У гэтым і ёсць адметнасць «новых» СМІ: кожны можа выказаць свае погляды, а таксама скантачыцца і са сваімі аднадумцамі, і з апанентамі.

### Блогі

Блогі — гэта электронныя дзённікі. Адрозненне іх ад звычайных у тым, што блогі публічныя. Іншыя інтэрнэт-карыстальнікі могуць распачаць палеміку з аўтарам. У беларускай блогасферы найбольшую папулярнасць мае Жывы Журнал — livejournal.com.

Блогеры адны з першых пачалі адлюстроўваць падзеі ў Тэгеране ледзь не пахвілінна. Простыя карыстальнікі інтэрнэту выкладалі на сваіх старонках невялікія паведамленні пра падзеі, што адбываліся на вуліцах горада, а таксама фота і відэа.

Пра падзеі пішуць сотні блогаў на англійскай і персідскай мовах, якія абнаўляюцца па меры сіл і ахвоты іх карыстальнікаў. Іх можна лёгка знайсці праз любы пошукавік. Аднак некаторыя з іх перыядычна не загружаюцца ці не абнаўляюцца, з прычыны таго, што іранскія ўлады ўвесь час спрабуюць заблакаваць сайты з інфармацыяй пра хваляванні ў Тэгеране.

Пра першых забітых людзей падчас іранскіх хваляванняў стала вядома ад звычайнай медсястры адной з бальніц. Дзяўчына на свае вочы пабачыла трупы і паведаміла пра гэта ў блогасферы.

Пацукі любяць цемру, кажа прымаўка. З распаўсюджаннем Інтэрнэту палітычным пацукам стала цяжэй выжываць.

**Настасся Шамрэй**

# Два розныя святы ў Бычках

**19 чэрвеня на радзіме Васіля Быкава адсвяткавалі 85-годдзе пісьменніка. Хуценька, цягам некалькіх хвілін, раённая вертыкаль, а потым ужо незалежная грамадскасць.**



Хата-музей у Бычках сустракала гасцей накрытым сталом ды гучнай музыкай. «Прэса прыехала», — камусьці па тэлефоне перадала жанчына пра цэлы аўтобус з пісьменнікамі, журналістамі і грамадскімі дзеячамі. А дзеці ў піянерскіх гальштуках пачалі саромецца ды хавацца адзін за аднаго.

Няёмка было і нам. Расійская народная музыка ды жанчыны ў хустачках, завязаных у найлепшых украінскіх традыцыях, піянерская гальштукі ды маленькі хлопчык у вайсковым строі. Калі б на хаце не вісела таблічка «Сядзіба-музей Васіля Быкава», то і не было б зразумела, куды ж мы патрапілі.

Разведка паказала, што мясцовы аддзел культуры арганізоўвае тут сваё свята. І, як толькі «вялікія госці» прыедуць, усё пачнецца. Незразумела было толькі, каго чакаюць. Валянціна, сястра Васіля Быкава, ужо тут. Рыгор Барадулін таксама сядзіць на прызбе хаты свайго сябра. Ды і гасцей сабралася больш за паўсотні. А свята ўсё не пачынаецца.

Аказалася, не хапала чыноўнікаў з райвыканкама. Як толькі яны прыехалі, усіх запрасілі да імправізаванай сцэны. Прадстаўнікі піянерскай дружыны імя Васіля Быкава Кубліцкай сярэдняй школы прачыталі шэраг вершаў пра Васіля Быкава. Віктар Праўдзін, першы сакратар афіцыйнага саюза пісьменнікаў, узнагародзіў музей дыпломам «за актыўны ўдзел у прапагандзе беларускай літаратуры і захаванне памяці народнага пісьменніка».

Далі слова і сястры Васіля Быкава. Спадарыня Валянціна пачала расказваць пра дзяцінства брата ды пра тое, як ён любіў родныя мясціны. Але доўгія размовы пра самога Быкава не ўваходзілі ў план мерапрыемства. Мікрафон у Валянціны забралі і аб'явілі, што ёсць дзесяць хвілін на наведванне музея, і пасля гэтага свята скончана. Жанчыны прыбралі талеркі з прысмакамі, гукааператары склалі апаратуру, пасядалі ў машыны ды з'ехалі ва Ушачы працягваць свята ў Доме культуры. А ля музея засталіся сябры і блізкія Васіля Быкава, а таксама «неафіцыйныя» госці.



Было сказана шмат цёплых слоў. Падзяліўся сваімі ўспамінамі пра пісьменніка Рыгор Барадулін. А потым мастак Алесь Пушкін атрымаў прэмію «За свабоду думкі», заснаваную Рухам за Свабоду. Першымі яе лаўрэатамі былі Рыгор Барадулін, Уладзімір Арлоў і Павал Севярынец. Сёлета менавіта яны былі ў журы і выбралі Пушкіна.

«Я зразумеў выбар журы так, што тут не ў Пушкіну справа. Тут справа ў чалавеку, які скончыў сваю ВНУ, вярнуўся да свайго народа, жыве са сваім народам, малюе ў храмах, ладзіць Купалле, Каляды. Журы, напэўна, уганаравала проста шлях жыцця», — расказвае пра свае ўражанні Алесь Пушкін.

Прамаўлялі таксама Алесь Марачкін, Уладзімір Арлоў, Лявон Баршчэўскі. А потым усіх запрасілі ў сядзібу-музей пісаць сімвалічную дыктоўку. У маленькай хаце хто дзе прыткнуўся: і на ложку Быкава, і за абедзенным сталом ды проста на падлозе. Сядалі, каб паслухаць словы Васіля Быкава пра вольнасць ды свабоду з вуснаў Рыгора Барадуліна ды Зінаіды Бандарэнка.



**Барадулін (у цэнтры) на прызбе быкаўскай хаты.**

Завяршылася свята ў гонар Быкава сяброўскай вячэрай пад адкрытым небам.Ды доўгай дарогай дадому.

**Настасся Шамрэй**

# Гісторыя аднаго шпіёна

**Польскае следства лічыць, што арыштаваны беларус Сяргей Моніч працаваў не толькі на КГБ, але і на расійскія спецслужбы.**

У Варшаўскім судзе няспешна разглядаецца справа беларуса Сяргея Моніча, які абвінавачваецца ў шпіянажы. Працэс закрыты. Месца паседжанняў вызначаецца ў апошнюю хвіліну, і назіральнікаў у залу суда не пускаюць. Але СМІ разведалі многія дэталі шпіёнскай гісторыі. Як выглядае, інфармацыя, здабытая беларускім выведнікам, не вартая выедзенага яйка. Хлопец занішто трапіў у польскую турму.

Вось як падае падзеі польскі часопіс «Палітыка».

Уся гісторыя закруцілася ў 2004 годзе, акурат тады, калі пачалася польска-беларуская дыпламатычная вайна. І вось у роспале яе дыпламат адной з краін СНД знаёміць свайго калегу і прыяцеля, консула польскага пасольства ў Мінску, з адным сваім беларускім сябрам. Яго зваць Сяргей Моніч, і ён прадстаўляецца дарадцам мэра Мінска па турызме. Ён выказвае спадзяванні, што разам з консулам яны змогуць развіць польска-беларускія турыстычныя сувязі. Яны абменьваюцца візітоўкамі.

Праз два месяцы Моніч упершыню тэлефануе польскаму дыпламату і просіць дапамагчы з атрыманнем візаў для знаёмых. Паляк — калі ласка, ідзе насустрач. Моніч у аддзяку шчодра «налівае». Яны яшчэ пару разоў сустракаюцца, і паляк упэўніваецца, што Сяргей працуе на спецслужбы. Не толькі беларускія, але і на расійскія. Ён прапануе паляку пастаўляць важную інфармацыю для беларускага КДБ і абяцае, што за інфармацыю будуць плаціць. Ён сапраўды плаціць па сто даляраў за драбніцы, абяцае пару тысяч за істотныя звесткі — яго цікавяць нумары сакрэтных тэлефонаў, дэталі прыватнага жыцця чыноўнікаў і т.п.



Моніч не ў курсе, што паляк адразу паставіў у вядомасць польскую контрразведку і атрымаў інструкцыі на вядзенне сакрэтнай гульні. Згодна з ёй, ён павінен быў расказваць малаістотную інфармацыю з мэтай з часам перацягнуць Сяргея на свой бок. Для гэтага ім трэба выцягнуць яго за мяжу. Дыпламат працуе ў ролі нажыўкі.

Апошняе спатканне ў Вільні 25 лістапада 2006 года было кароткім, усяго пару хвілін. Дыпламат згодна з інструкцыямі ўстаў з-за стала і выйшаў у прыбіральню. Тут жа ў рэстаран уварваліся супрацоўнікі літоўскіх спецслужбаў. Моніч не разгубіўся і нават спрабаваў супраціўляцца, спалоханыя кельнеры пахаваліся пад барную стойку. Моніча скруцілі. Калі паляк вярнуўся з туалета, рэстаран ужо апусцеў.

У студзені 2007-га ў Вільні Апеляцыйны суд падтрымаў рашэнне выдаць Сяргея Моніча польскаму боку. Беларус трапляе ў польскую вязніцу. Год таму ў Варшаве распачаўся суд над ім.

Беларусу пагражае да 10 гадоў турмы. Калі ён будзе асуджаны, то згодна з дамоўленасцю паміж Польшчай і Беларуссю, будзе накіраваны ў Мінск, дзе яго ў турме ніхто трымаць не будзе. Таму і марудзяць з працэсам — хітрую гульню вядуць разведкі.

Аб'ектыўную ацэнку ўсёй аперацыі даць цяжка. Гэта стане магчыма толькі пасля адкрыцця архіваў. Аднак, лічаць польскія журналісты, беларускі бок пасля той гісторыі нечакана стаў мякчэйшым і партнёрства на Усходзе атрымала новыя шанцы.

Ну а для беларускага боку? Жонка 42-гадовага Моніча ў «Народнай газеце» даказвае, што яе муж — ніякі не шпіён, а проста зацікаўлены ў развіцці бізнэсу. Для польскага суда гэта не аргументы.

**Падрыхтавала Вольга Жарнасек**

# Таемныя спружыны рэвалюцыі

**Украінская рэвалюцыя не грэбавала алігархамі, а амерыканская перамагла дзякуючы падтрымцы французскага абсалютызму. Паўстанне ў Іране мае шанцы таму, што за ім стаяць аятолы–мільярдэры. Піша ўсходазнаўца Сяргей Богдан.**



Выбіраючы пару тыдняў таму паміж вандроўкай ва Узбекістан і паездкай у Іран, я, не вагаючыся, з'ехаў ва Узбекістан. Ну што там глядзець на выбарах, думалася мне. Аднак ужо ў выбарчую пятніцу мае іранскія сябры патэлефанавалі мне: такога нахабнага фальшавання мы яшчэ не бачылі! Падтасоўка выбараў у Іране яшчэ не стала нормаю палітычнага жыцця.

Гэты шок тлумачыць, чаму столькі людзей выйшла на вуліцы. Новым у дэманстрацыях пратэсту быў і іх нечуваны размах — Мусаві лёгка збірае сотні тысячаў людзей пад свае штандары — і склад удзельнікаў. Папярэдні вялікі іранскі бунт вясны-лета 1999 года іранскі публіцыст Навід Кермані назваў «рэвалюцыяй дзяцей». Тады бунтавалі студэнты, якім не бракавала смеласці, але не ставала сувязі з «народам». Марна «Эканаміст» прарочыў канец ісламскага рэжыму, усё заціхла.

У наступныя гады былі новыя дэманстрацыі, драбнейшыя і буйнейшыя, былі шматтысячныя акцыі ў абарону асуджанага на смерць Агаджары, але падвалінаў рэжыму яны не чапалі.

Сёння ж на вуліцы выходзяць прадстаўнікі самых розных пластоў насельніцтва, у тым ліку і больш заможных. Таму ўлада і не можа так радыкальна расправіцца з дэманстрантамі, як у 1999 годзе. Адна справа — разганяць радыкальную моладзь, зусім іншае — страляць па буржуазіі і служачых, што масава выйшлі на вуліцы цяпер.

## Для Махмуда закон не пісаны

Не Мусаві пагражае дзяржаўнаму ладу ў Іране. Найцяжэйшы ўдар па падвалінах Ісламскай рэспублікі зрабіў не хто іншы як Ахмадзінежад. Гэты абраны праз сваю антыкарупцыйную праграму былы бурмістр Тэгерана адразу вылучыўся на прэзідэнцкай пасадзе дзвюма асаблівасцямі — хваравітай перакананасцю ў тым, што яму Усявышнім дадзеная высокая місія, ды эпатажным рэвізіянізмам.

З аднаго боку, Махмуд заявіў, што адчуваў над сваёй галавой арэол падчас выступу ў ААН, — і не пачырванеў нават, калі яго высмеялі за тое прылюдна прадстаўнікі духавенства. З другога — ставіў пад пытанне ўсё. Сусветную публіку шакавала ягонае адмаўленне нацысцкіх зверстваў у часе Другой сусветнай, але іранскую публіку найбольш шакавала, калі прэзідэнт у тэлепрамове стаў хваліцца, што вайна з Іракам у 1980-я скончылася б перамогай, калі б краінай тады кіраваў ён. Гэтай заявай Ахмадзінежад атакаваў увесь іранскі палітычны істэблішмэнт, а ўскосна — самога заснавальніка ісламскай рэспублікі — Хамейні.

Вяршыняй дэмагагічнага дару сталі яго спробы на тэледэбатах давесці, што інфляцыя ў Іране за яго часамі нават знізілася, хаця не трэба быць эканамістам, каб бачыць, што цэны растуць усё шпарчэй. Гэта, урэшце, пярэчыла статыстыцы, якую складае ягоны ж урад.

Перакананы ў сваім месіянскім прызначэнні для Ірана і свету, Ахмадзінежад пачаў ламаць асноўныя няпісаныя законы іранскай унутранай палітыкі, што склаліся за гады існавання Ісламскай рэспублікі.

Па-першае, у Іране ўплыў быў размеркаваны паміж рознымі палітычнымі сіламі, якія кантралявалі розныя галіны ўлады. Прыкладам, калі ў Радзе назіральнікаў сядзіць экстрэміст-аятала Мэсбах-Яздзі, дык у Асамблеі экспертаў старшынюе яго непрымірымы апанент Алі Акбар Хашэмі-Рафсанджані.

Пры Хатамі судовая ўлада зачыняла газеты сёння, а міністэрства выдавала ліцэнзіі на іх выпуск тымі ж людзьмі пад іншымі назвамі ўжо назаўтра. У такой канкурэнцыі груповак і плыняў кшталтаваўся своеасаблівы плюралізм іранскай палітыкі.

Але тут з'явіўся Ахмадзінежад, які пачаў выціскаць усіх «не-сваіх» з уладных установаў пад лямант пра карупцыю. Якая, вядома, ёсць, але паказальна, што за ўвесь тэрмін свайго прэзідэнцтва Махмуд так і не даказаў аніводнага буйнога карупцыйнага злачынства. Дзейнасць Ахмадзінежада пярэчыла законам іранскай палітычнай сцэны, акторы якой прызвычаіліся былі да стылю папярэдняга прэзідэнта Хатамі, які не наважваўся жорстка браць пад кантроль дзяржустановы і ў выніку цягам васьмі гадоў не змог ажыццявіць планаваных пераўтварэнняў. Махмуд, перакананы ў сваёй Боскай місіі, ліберальных забабонаў не меў — дзеля вяртання доўгачаканага Месіі можна і галасы інакш палічыць. Анягож, ён прыйшоў браць уладу, каб наблізіць час прыходу Боскай Справядлівасці ў свет, а таму людскія законы для яго былі неістотныя.

Тое, што апошнія выбары адбыліся менавіта так, як яны адбыліся, — з фантастычнымі фальшаваннямі, і тое, што з установы, якая ладзіла выбары, — Міністэрства ўнутраных справаў — амаль не было ўцечак інфармацыі пра фальшаванні, было заслугай Ахмадзінежада. Такога ў Іране яшчэ нікому не ўдавалася, калі не лічыць зрынутага шаха — таксама аматара элегантных перамог у 1950 — 1970-я гады. Той круціў народным волевыяўленнем, бо прагнуў зрабіць Іран звышдзяржавай, а гэты дзейнічае з эсхаталагічных меркаванняў.

У выніку Ахмадзінежад сутыкнуўся з супрацівам не толькі рэфарматараў, але і колішніх аднадумцаў-кансерватараў. Супраць яго і ягоных хаўруснікаў не раз выступаў Алі Ларыджані — кіраўнік парламенту, адзін з самых уплывовых іранскіх палітыкаў, аўтар ідэі выратавання рэжыму праз аднаўленне ядравай праграмы. Знішчальныя атакі на Ахмадзінежада і ягонае махлярства са статыстыкай зрабіў на апошніх выбарах кандыдат-кансерватар Мохсэн Рэзаі, былы шматгадовы камандзір Корпуса вартавых ісламскай рэвалюцыі. Апанаваны кансерватарамі парламент не раз адхіляў кандыдатуры прапанаваных прэзідэнтам міністраў.

## Ці магчымая ў Іране дыктатура?

Другім ударам па Ісламскай рэспубліцы было тое, што апошнія выбары былі адназначна ўспрынятыя шырокімі пластамі насельніцтва як скрадзеныя. Між тым, параўнальна свабодныя выбары ляжалі дагэтуль у аснове легітымнасці іранскага рэжыму, гарантавалі, што мэйнстрымная апазіцыя застанецца ў полі мірнай палітыкі, і за зброю ўхопяцца хіба толькі маргінальныя экстрэмісцкія групоўкі. Двума стаўпамі цяперашняй іранскай улады былі яе ісламскасць і рэспубліканскасць, хай сабе і ў трактоўцы імама Хамейні — першага «рахбара» (г.зн. «правадыра» на фарсі). Гэта карэнным чынам адрознівала яе ад саудаўскай тыраніі і талібскага цемрашальства ў Афганістане. Цяпер жа Ахмадзінежад і яго хаўруснікі фактычна выкідаюць прынцып рэспубліканскасці, без якой іранскі рэжымператворыцца ў копію талібскай дыктатуры.

Дзяржаву талібскага тыпу ў Іране не збудуеш, бо зашмат пісьменных людзей у гэтай краіне і занадта яна сучасная. Значыць, будзе папулісцкая дыктатура. У адрозненне ад большасці еўрапейскіх палітыкаў, Ахмадзінежад кіруецца не прынцыпамі рэалістычнасці, а прынцыпам Боскага наканавання, якое ведае толькі яго духовы настаўнік, і ідзе напралом.

Гэткая пазіцыя прэзідэнта паставіла пад пагрозу само існаванне традыцыйнай палітычнай эліты. Вось чаму Ахмадзінежад не можа так проста раздушыць пратэсты, нягледзячы нават на падтрымку Правадыра — аяталы Хаменеі. Зашмат тых, хто супраць, — адкрыта альбо таемна.

Прыхільнікі Ахмадзінежада сапраўды ставяцца да яго як да месіі. Гэта пераважна менш заможныя людзі.

У Іране сацыяльнае расслаенне мае выразныя формы, якія нам у Беларусі цяжка сабе ўявіць. Класы маюць розную культуру, нават «міжкласавыя» шлюбы — рэдкая з'ява. Мае месца і класавая варожасць.

Ахмадзінежад спасылаецца на інтарэсы паспалітых людзей, якія ён нібыта бароніць, ездзіць па краіне, шчодра раздаючы грошы. Вынікам ёсць інфляцыя і далейшае збядненне, але крыўда на ўсе беды скіроўваецца супраць «багатых» і «карумпаваных», якія, маўляў, Махмуду «мяшаюць». На глебе такіх настрояў Ахмадзінежад стварыў сабе сваё палітычнае поле, дзе дзейнічаюць ягоныя ўласныя законы і дзе няма месца тым, хто нязгодны.

## Разам з Ахмадзінежадам абрынецца сістэма?

Дэманстранты ў Іране маюць шанцы перамагчы, бо супрацьстаіць ім далёка не маналітная дзяржаўная машына, многія часткі якой супрацьдзейнічаюць адна адной. Не забывайма, што Ісламская рэвалюцыя таксама доўжылася амаль паўтара года, перш чым шах уцёк з краю у студзені 1979-га.

Выбары паглыбілі старыя расколіны ў палітычнай эліце Ірана. У прыватнасці, тлее напруга між цяперашнім правадыром краіны (галоўным клерыкам, што наглядае за палітычным працэсам і ўмешваецца ў яго пры пільнай патрэбе) аяталам Хаменеі і звышзаможным і ўмераным па палітычных поглядах аяталам Рафсанджані.

Рафсанджані пачаў браць удзел у падпольным палітычным змаганні шмат раней за Хаменеі — яшчэ ў 1950-я і за шахам адседзеў 9 гадоў у турме. Рафсанджані меў прычыны не любіць «выскачку» Хаменеі, але стары ліс працаваў з ім, пакуль быў прэзідэнтам.

Бой паміж Рафсанджані і Ахмадзінежадам ідзе насмерць: «за падбухторванне мітынгаў» арыштавалі дачку, унучку і яшчэ траіх сваякоў Рафсанджані...

## Гульня з многімі невядомымі

Складаныя палітычныя раскладкі дазволілі Мусаві і ўсяму рэфарматарскаму табару займець сабе магутную матэрыяльную падтрымку. Шырокая кааліцыя з удзелам кансерватараў, якія разумеюць, што наступнымі пасля лібералаў Махмуд з'есць іх, дае шанцы людзям адстаяць рэспубліканскія свабоды.

Што зробіш, украінская рэвалюцыя не грэбавала алігархамі, а амерыканская перамагла выключна дзякуючы падтрымцы французскага абсалютысцкага рэжыму. Жыццё часам — гэта не выбар паміж добрым і кепскім, а выбар паміж дрэнным і яшчэ горшым.

# Бацька хрышчонага сына

**Андрэй Кабякоў — герой новага артыкула з серыі «Палітбюро–2009». Піша Аляксандр Фядута.**

Пры Аляксандру Лукашэнку вырасла прынцыпова новае пакаленне выбарцаў. Яны не памятаюць Савецкага Саюза, слаба сабе ўяўляюць, чым менавіта кіраваў Пятро Машэраў. Для іх час пачаўся і працягваецца эпохай Аляксандра Лукашэнкі. І ўвесь гэты час побач з першым прэзідэнтам краіны знаходзіцца Андрэй Кабякоў. Прэм'ер-міністры мяняюцца, а Кабякоў застаецца.


PHOTO.BYMEDIA.NET

## «Гагарын» з Рагачова

Гэта сёння ўсе вымудраюцца з нагоды маладосці новага міністра культуры. Ды Паўлу Латушку і не сніўся той кар'ерны ўзлёт, які здзейсніў у 1994 годзе Андрэй Кабякоў, сціплы намеснік дырэктара рагачоўскага завода «Дыяпраектар». У тыя часы гэтае рагачоўскае прадпрыемства саступала па сваім кадравым патэнцыяле хіба што Магілёўскаму абкаму КПБ. Праўда, у Магілёўскім абкаме працавалі майстры на ўсе рукі — хоць на кіраўніка Адміністрацыі, хоць на Кіраўніцтва справамі, хоць на тэлебачанне прызначай. А «Дыяпраектар» даў Беларусі яе першага вярхоўнага кантралёра — тагачаснага дэпутата Вярхоўнага Савета БССР XII склікання (што плаўна перацёк у Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь) Васіля Даўгалёва, што ў парламенцкіх кулуарах атрымаў мянушку «Вася Морж» за свае маржападобныя вусы.

Менавіта Даўгалёў фактычна вызначыў склад першай Адміністрацыі прэзідэнта, атрымаўшы на гэта «дабро» ад яе першага кіраўніка Леаніда Сініцына. Ціха пафукваючы ў вусы, спадар Васіль зрэзаў да мінімуму ўсе яе структурныя падраздзяленні, зрабіўшы кіруючай і накіроўваючай сілай Службу кантролю і падпарадкаваўшы яе сабе. А на пасаду намесніка начальніка Службы кантролю — гэта значыць, уласнага намесніка — узяў свайго былога калегу па «Дыяпраектары», Андрэя Кабякова.

У Кабякова было два плюсы. Па-першае, ён нарадзіўся і вучыўся ў Маскве, у Маскоўскім авіяцыйным інстытуце — значыць, дурнем апрыёры не быў. Па-другое, працаваў намеснікам дырэктара «Дыяпраектара» па пытаннях эканомікі, а значыць, на думку былога галоўнага заводскага забеспячэнца Даўгалёва, эканоміку дакладна ведаў.

Так у 1995 годзе ў няпоўныя 35 гадоў Андрэй Кабякоў стаў адным з самых уплывовых людзей Беларусі. Бо пры Лукашэнку кантралёры былі і ёсць людзьмі нават больш уплывовымі, чым сам Лукашэнка. Бо гэта ён думае, што ўсё вакол кантралюе. Насамрэч усе кантралююць яны.

А калі ў 1996 годзе, пасля змены Канстытуцыі, на праслаўтым рэферэндуме Служба кантролю прэзідэнта замяніла сабой усё вакол — проста таму, што кантрольны орган парламенту быў ліквідаваны разам з адпаведнымі паўнамоцтвамі самога парламента — спадар Андрэй нечакана выцесніў са свайго кантралюючага фатэля. Было гэта звязана з тым, што Даўгалёва канчаткова і беспаваротна выціснулі з кантрольных органаў, замяніўшы Мікалаем Дамашкевічам, якому даўгалёўскія кадры былі не трэба. Але паколькі Кабякоў быў проста ўвасабленнем лаяльнасці (яшчэ б!), выкідаць назад у Рагачоў яго не сталі, а перасунулі на нейкі час у кабінет прэзідэнта канцэрна «Беллегпрам» — тым больш, з лёгкай (лё-о-ганькай прамысловасцю, як казалася ў старым савецкім фільме) у нас ва ўсе часы было дрэнна.

Аднак і тут Кабякоў чамусьці не патануў. А ўжо ў хуткім часе вярнуўся на любімую кантралюючую ўсё і ўсіх працу, замяніўшы сабой Мікалая Дамашкевіча.

## Кантроль і ўлік

«Сацыялізм — гэта кантроль і ўлік», — казалі ў савецкай старажытнасці. Можна было пры жаданні дадаць да гэтага электрыфікацыю ўсёй краіны. У нас, у суверэннай Беларусі, дадалі газіфікацыю, бо ўсё, што можна было, электрыфікавалі да Лукашэнкі. А ў астатнім быў поўны парадак: кантроль і ўлік забяспечвалі па меры магчымасцяў, жадання і патрэбы, што назбіраліся за час эканамічнай вольніцы першых гадоў суверэнітэту.

Праўда, кожны з галоўных кантралёраў краіны падыходзіў да даручанай яму справы з некаторымі індывідуальнымі асаблівасцямі. Хтосьці — творча, хтосьці — проста з бульдожым імпэтам.

У параўнанні з Мікалаем Дамашкевічам Кабякоў на пасадзе галоўнага кантралёра Беларусі ствараў уражанне проста анёла бесцялеснага. Бо Дамашкевіча ведалі ўсе і па імені, і па імені па бацьку. А пра існаванне Кабякова здагадваліся толькі тады, калі яго імя з'яўлялася ў зводках навін пра тое, каго і з якім дакладам прыняў прэзідэнт. Пры Дамашкевічу кантралёры са скуры лезлі, цiснуліся ва ўсе шчыліны. Пры Кабякову яны сталі нейкімі падазрона добрымі і спагадлівымі. Імаверна, Кабякоў проста памятаў тыя часы, калі сам працаваў на прадпрыемстве і намагаўся, па меншай меры, нікому без патрэбы не замінаць. Надышоў, як падавалася, час адноснай адлігі.

> **Пры Лукашэнку кантралёры былі і ёсць людзьмі больш уплывовымі, чым сам Лукашэнка. Бо гэта ён думае, што ўсё вакол кантралюе. Насамрэч усе кантралююць яны.**

Менавіта таму нікога асабліва не здзівіла, калі Кабякова канчаткова знялі з пасады старшыні Камітэта дзяржкантролю, замяніўшы яго Анатолем Тозікам, што спачатку падаваўся крэатурай Віктара Шэймана. А Кабякова (ну не высылаць жа яго назад у Рагачоў? За што?!) выправілі ва ўрад, як раней выправілі туды сама (а пасля адтуль сама) няўрымслівага Даўгалёва. Відаць, ёсць нешта ў гэтых рагачоўскіх кадрах такое, што робіць іх папросту неацэннымі.

## Яго эканамічная мосць

Так Андрэй Кабякоў зрабіўся спачатку першым віцэ-прэм'ерам, а потым віцэ-прэм'ерам — міністрам эканомікі. Імаверна, ён здолеў пераканаць ужо не толькі рагачоўскіх забеспячэнцаў, але і шклоўскіх актывістаў перадвыбарчай кампаніі Аляксандра Лукашэнкі ў тым, што добра разумее ў эканоміцы.

Гэтага якраз дасягнуць было не так ужо і складана. Ад папярэднікаў на сваёй пасадзе спадар Кабякоў адрозніваўся маладосцю, энергічнасцю і гатоўнасцю асвойваць новую тэрміналогію. Праўда, скажам, ад Пятра Пракаповіча ён адрозніваўся яшчэ і тым, што не жадаў пазбягаць асабістага ручнога кіравання эканомікай. Пракаповіч у такіх выпадках абапіраўся на меркаванне «высокапрафесійных кадраў», і калі «кадры» казалі, што нечага лепей не рабіць, Пракаповіч і не рабіў, а калі і рабіў, дык не сам, а перадаручыўшы кашмарную місію тым самым «яйкагаловым»: маўляў, ведаюць, як выканаць найвышэйшы загад з мінімальнымі стратамі і для радзімы, і для начальства. Кабякоў жа, як сцвярджаюць кампетэнтныя крыніцы, умудраўся — і дагэтуль умудраецца — уносіць выпраўленні ва ўжо ўзгодненыя і, здавалася б, зацверджаныя ўрадавыя дакументы. А паколькі прафесіяналізм застаўся зашкальваць на ўзроўні ўсё таго ж «Дыяпраектара», дык перыядычна ва ўрадзе хто-небудзь пачынае лаяцца, глытаць таблеткі і згадваць ні ў чым не вінную кабякоўскую маму.

Насамрэч, мама Кабякова ні ў чым не вінная. Вінным, паводле чутак, з'яўляецца сын галоўнага эканаміста беларускага ўрада. Не ведаю, праўда ці не, але па ўрадавых кабінетах упарта ходзіць наступная легенда. Маўляў, неяк Кабякоў, ужо як быў у найблізкэйшым атачэнні кіраўніка дзяржавы, упрасіў Лукашэнку стаць хрышчоным бацькам свайго сына (у сэнсе, Кабякова-сына, а не сына Лукашэнкі). Чамусьці кіраўнік дзяржавы, які такога панібрацтва з першага дня свайго прэзідэнцтва не ўхваляў, неяк адтаяў, забыўся пра свой атэізм, але затое ўзгадаў пра праваслаўе, і, кажуць злыя языкі, пагадзіўся.

І менавіта гэтым ва ўрадавых калідорах тлумачаць сакрэт чыноўніцкага доўгажыхарства Андрэя Кабякова.

А ўжо чыноўніцкую эфектыўнасць чалавека, які адказвае за вызначэнне стратэгіі доўгатэрміновага эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь, вызначыць можа толькі замежны інвестар.

## ...і іншае праграмнае забеспячэнне

Менавіта Кабякоў стаў фактычным кіраўніком распрацоўкі галоўных эканамічных дакументаў краіны. Гэта Дзяржаўная праграма інавацыйнага развіцця на 2007—2010 гг., Праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця на 2006—2010 гг. і Дзяржаўная праграма адраджэння і развіцця вёскі на 2005—2010 гг. Ніхто іх ад паважанага чытача не хавае: усе яны шчасліва вывешаны на сайце беларускага ўрада. Так што ахвочыя павесяліцца могуць спакойна, за кубачкам кавы і гаванскай сігарай, атрымаць асалоду ад пасажаў накшталт:

«На РУП «Мінскі трактарны завод» будзе рэалізаваны інвестыцыйны праект па павелічэнні вытворчай магутнасці да 75 тыс. трактароў у год» (с.18).

Там не напісана, куды будуць збываць гэтыя самыя 75 тысяч трактароў у год. І сёння, калі да часу «Ч» засталося ўжо менш за год, абсалютна відавочна, што лічба гэтая была напісаная не для таго, каб выпускаць 75 тысяч трактароў у год, а выключна, каб задаволіць патрабаванне кіраўніка дзяржавы, які ўсур'ёз паверыў у тое, што ўвесь свет толькі і прагне, што купляць беларускія трактары. Таму што ў 2005 годзе, калі праграма распрацоўвалася, людзі, што адказвалі не толькі за вытворчасць, але — што ва ўмовах адмоўнага замежнагандлёвага сальда, якое ўжо абрынулася на краіну, нашмат важней — за збыт прадукцыі, маглі сфармуляваць гэтую лічбу толькі па прынцыпе Хаджы Насрэдзіна: маўляў, хтосьці да 2010 года ўсё адно сыдзе ў адстаўку — ці я, ці шах, ці «ішакі» з завода. А не сыдуць — дык на іх усё і спішам!

Менавіта Андрэй Кабякоў па пасадзе адказвае за ўсе змены, што адбыліся ў статусе так званых індывідуальных прыватных прадпрымальнікаў. Вядома, ён бы з вялізным задавальненнем не выконваў гэтага глупства, навеянага мудрымі загадамі з Адміністрацыі, ледзьве не інспіраванымі спадаром Ткачовым (мы пра яго і яго ролю ўжо расказвалі). Але — супраць бацькі, як вядома, не папрэш.

Увогуле, калі Лукашэнка быў хрышчоным бацькам беларускага эканамічнага цуду ў тыя часы, калі пра цуд казаць яшчэ можна было без ухмылкі, дык Андрэй Кабякоў па пасадзе выконваў пры ім функцыі бабкі-павітухі. А калі з немаўлём адбылося тое, што адбылося, павітуха спавіла замест яго палена і пачала весела строіць яму «казу» — ну, каб бацька не расстроіўся раней часу.

## Не да часу

Справа зусім не ў тым, ведае эканоміку Андрэй Кабякоў ці не ведае. Проста ў ім глыбока-глыбока жыве інструктар Рагачоўскага гаркама кампартыі (а Кабякоў паспеў адпрацаваць на гэтай пасадзе два гады), які прывык добрасумленна выконваць волю начальства і ведае, што ініцыятыва караецца. А раз караецца — лепей яе не праяўляць.

Дарэчы, менавіта Кабякоў адказвае за працэс прыватызацыі ў нашай краіне. Той самай прыватызацыі, якая ці то ёсць, ці то няма яе — адзін Кабякоў толькі і ведае насамрэч.

Да гэтага ж, здаецца, Кабякоў — паталагічны баязлівец. Ён не ўмее казаць «не». Ён не ўмее і не хоча пярэчыць начальству.

У мірны час, час без крызісаў і ўзрушэнняў, з такім эканамічным гуру можна было б жыць. Абы рукамі нічога не чапаў.

Але цяпер толькі ўскрыцце пакажа, як далёка загнаў эканамічныя хваробы бацька хрышчонага сына кіраўніка Беларусі. Калі, вядома, ён і сапраўды — бацька хрышчонага сына.

У гэтай якасці ён быў бы амаль бяскрыўдны і бяспечны.

На пасадзе віцэ-прэм'ера па эканамічных пытаннях? На жаль! Не да часу.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

# Мікола Статкевіч: Не лічыць шанцы, а змагацца

**По абранні Міколы Статкевіча кандыдатам у прэзідэнты ад Кангрэса еўрапейскага выбару палітык адказаў на пытанні карэспандэнта «НН».**

**«Наша Ніва»: Якія ўражанні ад Кангрэса? Ён абнадзеіў Вас?**

**Мікола Статкевіч:** Безумоўна. Кангрэс прадэманстраваў здольнасць «Еўрапейскай кааліцыі» выконваць пастаўленыя задачы. Мерапрыемства было арганізавана аператыўна і досыць якасна.

**«НН»: Калі прынялі рашэнне аб сваім вылучэнні?**

**МС:** Такое рашэнне было прынятае на Сойме БСДП «Народная грамада» 23 траўня. Мы не афішавалі тады гэтае рашэнне, чакалі Кангрэса. Досыць нечакана я аказаўся адзіным кандыдатам ад «Еўрапейскай кааліцыі».

Цяпер вось адны віншуюць, іншыя спрачуваюць. Спадзяюся, што гэтае вылучэнне неяк застрахуе мяне ад турмы. Бо перад дзвюма папярэднімі прэзідэнцкімі кампаніямі на мяне заводзілі крымінальныя справы.

**«НН»: Людзей хопіць, каб правесці паўнавартасную выбарчую кампанію?**

**МС:** Думаю, што так. Кангрэс мог бы быць і больш шырокім, калі б улады далі іншую залу. У гэтай жа былі пэўныя квоты ад кожнай арганізацыі, і яны былі выкананыя.

**«НН»: З якімі лозунгамі і абяцаннямі пойдзеце на выбары?**

**МС:** Думаю, што для іх выпрацоўкі трэба будзе правесці яшчэ адзін Кангрэс. Плануем яго ў пачатку наступнага года ва Украіне.

**«НН»: Ці магчыма аб'яднанне з іншымі апазіцыйнымі кандыдатамі?**

**МС:** Так, мы гатовыя да супрацоўніцтва. Пачакаем, каго вылучаць Аб'яднаныя дэмакратычныя сілы, можа яшчэ хто. Ёсць наша стратэгія, якая была прынятая Кангрэсам, і калі імаверны кандыдат згодзен з ёй, то мы гатовыя з ім працаваць.

Самае галоўнае, што я хачу зазначыць, кандыдат павінен быць гатовы абараняць сваю перамогу нават у выпадку небяспекі для ўласнага жыцця.

**«НН»: А што наконт супрацоўніцтва з Мілінкевічам?**

**МС:** У Мілінкевіча быў шанец на мінулых выбарах. Ён не зусім добра ім скарыстаўся. У 2006 годзе ў яго была разгубленасць, няведанне, што рабіць. Не хочацца, каб гэта паўтарылася. Я думаю, што Мілінкевіч мусіць знайсці сабе нейкую іншую функцыю.

Што да праектаў Руху за Свабоду, накіраваных на падтрымку еўрапейскага выбару Беларусі, то мы гатовыя іх падтрымліваць. Я сам прыйду на форум, які рыхтуе на кастрычнік Аляксандр, калі ён будзе непалітычны.

**«НН»: У 2010 годзе шанцы перамагчы ёсць?**

**МС:** Наша справа не лічыць шанцы, а змагацца. Толькі нейкая дзейнасць знаходзіць водгук у людзей. Зарабляць сабе пазітыўны імідж. Калі нават шанцаў на перамогу няма, то нас усё адно не зразумеюць, калі мы не паспрабуем.

**Гутарыў Зміцер Панкавец**

**Мікола Статкевіч**
нарадзіўся 12 жніўня 1956. Ён на два гады маладзейшы за Аляксандра Лукашэнку. Старшыня аргкамітэта Беларускай сацыял–дэмакратычнай партыі «Народная Грамада». Адзін са стваральнікаў знакамітага на пачатку 1990–х Беларускага згуртавання вайскоўцаў, якое дамагалася беларусізацыі войска, атрыманага ў спадчыну ад СССР.

У 1978 скончыў Мінскую вышэйшую інжынерную зенітна–ракетную вучэльню СПА. Кандыдат тэхнічных навук, падпалкоўнік запасу. У 2005 быў асуджаны на два гады абмежавання волі за падрыхтоўку і правядзенне вулічных акцый пратэсту супраць вынікаў рэферэндуму 2004. Пакаранне адбываў у Баранавічах і вёсцы Блонь (Пухавіцкі раён). Міжнароднай арганізацыяй Amnesty International прызнаны вязнем сумлення.

# 500 чалавек узялі ўдзел у кангрэсе Статкевіча

**Апазіцыя правяла першы Кангрэс па вылучэнні кандыдата ў прэзідэнты на наступныя выбары.**

Яго ініцыятарам быў старшыня аргкамітэта БСДП «Народная грамада» і былы палітвязень Мікола Статкевіч. Кангрэс здолеў сабраць пяцьсот чалавек.

Кангрэс праходзіў у Палацы культуры МТЗ. З раніцы там прайшоў сход актыву сяброў Партыі БНФ, які склікаў Лявон Баршчэўскі. На заклік старшыні адгукнулася каля двухсот чалавек. Шмат хто форум вырашыў прабайкатаваць. У тым ліку адзін з найбольш імаверных пераемнікаў Баршчэўскага на пасадзе кіраўніка партыі — Аляксей Янукевіч.

У выніку на сход зарэгістравалася каля 220 удзельнікаў, у зале знаходзілася блізу 180 чалавек, разам з журналістамі і назіральнікамі.

Сход разглядаў два галоўныя пытанні: аб удзеле Партыі БНФ у наступнай прэзідэнцкай кампаніі і ўзаемадачыненнях з іншымі палітычнымі суб'ектамі, а таксама аб папярэднім вызначэнні кандыдата ад БНФ у наступныя прэзідэнцкія выбары. Сход рэкамендаваў вылучыць Лявона Баршчэўскага ў якасці кандыдата.

Цікава, што над сцэнай вісеў вялікі чырвона-зялёны сцяг. Зняць яго ніхто не адважыўся, бо дырэктар палаца паабяцаў у адваротным выпадку санкцыі супраць арганізатараў. Віктар Івашкевіч на гэта сказаў: «Калі не хочаце бачыць гэты сцяг, то перамагайце на наступных выбарах».

Прыкладна у 15.30 БНФ ласкава саступіў залу для Кангрэса еўрапейскага выбару, якому Мінгарвыканкам у памяшканні адмовіў. Дарэчы, частка сяброў Фронту сышла, а частка засталася.

Па візуальных падліках у зале было больш за пяцьсот чалавек, але цяжка сказаць, ці ўсе яны былі дэлегатамі.

Мікола Статкевіч кажа, што ўсе суб'екты кааліцыі выканалі свае квоты. «Народная грамада» прывяла на мерапрыемства 250 чалавек, рух «Разам» Вячаслава Сіўчыка і Аляксандра Макаева — 200, аргкамітэт сацыял-дэмакратычнай партыі «Свабода» Сяргея Скрабца — 100. Ад апошняй людзі былі досыць дзіўныя. Ад некаторых хлопцаў, мякка кажучы, патыхала алкаголем. Асаблівай цікавасцю да таго, што робіцца ў зале, яны таксама не вылучаліся.

Ужо па з'ездзе чуў, як адна жанчына-дэлегат казала суразмоўцу: «Нарэшце даведалася, хто такі Скрабец».

Кангрэс праходзіў у імклівым тэмпе. Асаблівых абмеркаванняў адносна стратэгіі і дэкларацый не было. Усе яны папярэдне былі надрукаваныя ў «Народнай волі». Прапанавалася іх зацвердзіць. Хіба што некаторае ажыўленне выклікала рэпліка аб замене ў тэкстах «рускай мовы» на «расійскую». Згадзіліся на такія змены.

Ад пачатку не планавалася, што Кангрэс абярэ адзінага ад «Еўрапейскай кааліцыі». Аднак на справе выйшла інакш.

Галоўны рэдактар «Борисовских новостей» Анатоль Букас прапанаваў Міколу Статкевіча, а былы палітвязень Цімох Дранчук — свайго новага шэфа Сяргея Скрабца. Сіўчык і Макаеў нікога вылучаць не сталі. Скрабец зняў сваю кандыдатуру на карысць Статкевіча.

Такім чынам, спадар Мікола застаўся адзіным прэтэндэнтам. За яго прагаласавала большасць дэлегатаў. Супраць выступілі толькі 11 чалавек, яшчэ 22 устрымаліся.

У сваёй інаўгурацыйнай прамове Статкевіч зазначыў: «Я не збіраюся ўхіляцца ад гэтай адказнасці. Я гатовы змагацца. Я кажу не толькі за сябе. За мной 17 пакаленняў маёй сям'і, якая 600 гадоў служыла Беларусі. Я даю слова гонару ад імя сябе і сваіх продкаў. Я пайду да канца. Я не звярну».

Першы адзіны кандыдат ад апазіцыі ёсць.

Падобныя кангрэсы таксама збіраюцца правесці Аб'яднаныя дэмакратычныя сілы, а таксама Рух за Свабоду.

**ЗП**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Група дзіўных персанажаў зарэгістравалася на Кангрэс ад Сяргея Скрабца. Ад многіх з іх патыхала алкаголем. Пара заснула проста ў зале. Іншыя цікавасці да выступаў таксама не выказвалі. Дый яшчэ пачалі задзіраць журналістаў.**

## Карняенка: «Палітычны імпатэнт Скрабец адзначыўся яшчэ і хлуслівасцю»

### Чые людзі прыйшлі п'янымі на Кангрэс еўрапейскага выбару?

Старшыня аргкамітэта Сацыял-дэмакратычнай партыі «Свабода» Сяргей Скрабец выбачыўся за некарэктныя паводзіны некаторых з дэлегатаў ад яго групоўкі падчас Кангрэса еўрапейскага выбару і выказаў меркаванне, што гэта была правакацыя: «Гэта, увогуле, не нашы людзі. Гэта людзі, якія належаць да аднаго вядомага грамадскага аб'яднання, нядаўна зарэгістраванага з вельмі падобнай назвай<...> На сённяшні дзень яны ўжо самі прызналіся, што атрымалі заданне ад кіраўніцтва свайго руху дыскрэдытаваць Еўрапейскі кангрэс». Віктар Карняенка, намеснік старшыні Руху за Свабоду, заяўляе, што гэта паклёп: «Ніякага дачынення Рух за Свабоду не мае ні да тых падзей, ні да тых людзей, якіх нехта там частаваў півам. Палітычны імпатэнт спадар Скрабец адзначыўся яшчэ і хлуслівасцю. Нас не цікавяць падзеі, якія не датычаць працы з людзьмі і не маюць канкрэтных вынікаў».

**НШ**

# Там, дзе гразі не баяцца

Рэпартаж з фестывалю альтэрнатыўнай музыкі і жыцця «Пустыя ўзгоркі».


MISTER23.LIVEJOURNAL.COM

Хтось афарбаваў свой чэрвень фестывалем Be2gether, ну а хтосьці — «Пустымі ўзгоркамі», што адбываліся ў тыя ж дзянькі ля вёскі Булгакава, на мяжы Смаленскай і Калужскай абласцей Расіі.

Сонца-дождж-сонца — фармат сёмага фестывалю. А гэта значыць, гразь. Брудныя дарогі паўсюдныя і ногі босыя, па калена запэцканыя. Захраслы трактар «Беларусь», электрычнасць раз за разам знікае. Частка праграмы адмененая. Нервуюцца арганізатары. Ды, здаецца, без брудных ног было б не так нешта, няправільна і нецікава нейк...

48-гадовы ўкраінскі хіпі Ян прыязджае на кожны фэст. Ён робіць «растачкі» і мілых вышытых мятлушак прадае. «Тут мора пазітыву! Надвор'е сёлета не вельмі, але ўсе, як дзеці, радуюцца ў гэтай багне, з якой ледзь крадзілы не вылазяць!» — цешыцца ён. «Гразь — гэта ілюзія», — разважае хтось шыльдачку на ўзбочыне лясной дарогі.

«Пустыя ўзгоркі» — open-air свабоднай творчасці. Шаснаццаць сцэн: Зямля, Сонца, Поўня, Сатурн, Сірыус... Ганарараў музыкі не атрымліваюць, а гасцям фестывалю набываць квіткі не трэба. Ахвяраванні, валанцёрства, партнёрская дапамога — так і жывуць «Узгоркі».

Хто прыязджае пафестываліць? Ды хто заўгодна. Напрыклад, шмат беларусаў. Напрыклад, хіпоўскія дзяўчынкі, якім натуральна і прыгожа хадзіць без станіка. Шмат-шмат дрэдлатых людзей і людзей з фенькамі. Панкі, што смокчуць гарэлку, ды тыя, хто на тэрыторыю летніку наметы палільшчыкаў не прымае. Аўтастопшчыкі — дзяўчынка з Мінску, а хлопчык з Кішынёва ці Піцеру. І нястрашна ім развітацца-раз'ехацца пасля «Узгоркаў», цалкам верагодна, назаўжды. Сустракаю каманду з роднага Брэсту, што здымае кіно пра фестываль.

Рок, фолк, джаз, электроншчына, рэгі... «Птицы Тылобурдо», «ВПР и Фестиваль всего на Свете», беларускія «Маланка orchestra» на чале з Лёнем Паўлёнкам, што з'ехалі, так і не выступіўшы з-за праблемаў з электрычнасцю. Украінская «Atmasfera», маскоўскі «Elefant»...

Дзёрзкая рок-жанчына Умка трапляе сюды праз дождж і гразь, з прыгодамі. «Але гэта адзінае месца, куды я згодная прарывацца з такой сілаю!» — кажа спявачка. Атачаная натоўпам, яна гарланіць спевы пад павеццю. А потым з акустычнай гітарай і без мікрафона перамесціцца на сцэну. Але ж вось і электрычнасць, сонца вось! Крычаў, спяваў і жартаваў тут наш зямляк Сяргей Пукст, якога слухалі ўважліва. «Я задаволены выступам, хаця і ёсць адчуванне недачутасці мяне слухачом», — кажа ён. А пагалоскі «Сёння «Адыс Абеба!» пачуць было можна задоўга да іх выступу. Гэтых растаманскіх беларусаў тут чакалі, радасна фанацкімі крыкамі віталі.

А апроч музыкі, быў там авангардны тэатр (у тым ліку брэсцкі «Свабодны тэатр»), кіно, заняткі ёгай, майстар-класы па фота. Была нават афрыканская вёска з сваёй экзатычнай культурай. Таксама лепка з гліны, шаманскія практыкі і медытацыі, танцы-кружэнні дэрвішаў у шматколерных спадніцах.

«Можа, ты забыўся, што ўсё гэта свята для цябе?» — гучыць са сцэны. А над галовой неабдымнае неба, і людзі танчаць, карагоды водзяць. Але ўсё гэтае свята, жыццё гэтае — для мяне! «Узгоркі» прыгадваюць таму, хто забыўся, што ў жыцці ёсць радасць. Вось намётавы гарадок з агароджай—балонікавай гірляндай. Вось прыбіральня, расфарбаваная сонейкамі і чабурашкамі. А ўсмешлівая дзяўчынка, стоячы пасярод людной дарогі, арэхі раздае.

«Узгоркі» прыгадваюць, што ёсць дабрачыннасць, узаемадапамога і ўважлівае стаўленне да прыроды. Грошы ад прададзеных цішотак з лагатыпам «Узгоркаў» аддадуць хворым. А пасля фестывальных дзён каманда добраахвотнікаў застаецца прыбіраць тэрыторыю. І многа-многа тут валанцёраў, на якіх і трымаецца фестываль. Беларускі студэнт Паша ўладкаваўся ў вегетарыянскае кафэ. «Я атрымаў не толькі адпачынак, але і іншым дапамог. Здарава, што аб'ядналіся людзі, у якіх ёсць сунастроенасць — вегетарыянства, напрыклад, ці ёга». Можа быць, «Узгоркі» — гэта і не фестываль зусім. А казачная краіна, што пяць дзён выбухала колерамі, радасцю і сяброўствам.

**Кацярына Безмацярных**



# Беларуска выпускае сінгл у Нью-Ёрку

Спявачка Olyia, Вольга Казак, у хуткім часе мае выдаць свой першы сінгл. Ёй дапамагаюць такія вядомыя ў Нью-Ёрку выканаўцы RnB, як Чарльз Мэк, Брыз Джэннінгс і папулярны гурт NJ5.

Вольга Казак нарадзілася ў Мінску, але гадавалася ў Бронксе: яе бацькі, музыкі Алесь Казак і Валянціна Пархоменка, выехалі з Беларусі ў 1990 г. Іх сямейны фолк-гурт бярэ ўдзел у вечарынах, якія ладзіць беларуская дыяспара ў ЗША. Вольга вучылася на журналістку, але кар'ера RnB-спявачкі прываблівае яе больш.

У рэпертуары Вольгі — не толькі англамоўныя кампазіцыі. На яе сайце www.myspace.com/olyiamusic можна паслухаць песню «Белая Беларусь». З лёгкім амерыканскім акцэнтам, айрэнбішнымі ноткамі і цытатамі з Багдановічавай «Пагоні» Olyia выводзіць:

Беларусь, наша маці-краіна,
Ты зрабіла з нас моцных людзей,
Не загінулі мы і не згінем,
Будзем разам змагацца далей.

**ЛК**

## ДЫСКАГРАФІЯ

### Адыс Абеба

Шифроваться, 2009, addis-abeba.ad.by




**У кампазіцыі пра чабурашку праскокваюць ноткі псіхадэлу.**

Мінска-гомельскі праект незаслужана заціснуты (самім сабой) у межы рэгі. Гэты альбом даводзіць, што іх музычны кругляд куды шырэйшы, а слоў хапае не толькі на апяванне Джа. Класічныя песенькі ў дадзеным кірунку, вядома ж, прысутнічаюць, і пасля першых трэкаў пачынаеш ужо нудзіцца, пакуль у чацвёртым не прарываецца брудная гаражнасць. Далей — болей: музыкі даюць цуднага фанку, заляцаюцца да джазу, рускага року, а ў кампазіцыі «Чабурашка» праскокваюць ноткі псіхадэлу (дасціпная гісторыя пра тое, як герой песні надта хацеў чабурашку, але ніхто яго не дарыў, таму ён сам сабе прыляпіў вушы).

Бліжэйшыя суродзічы «Адыс Абебы» — «Ляпіс» часоў «Залатых яйцаў» ды група «Ноль». Часам вакаліст Дзіма Іваноў надта хіліцца ў гэтую рускарокерскую эстэтыку, апяваючы побытавую рамантыку з паходам па віно ў краму і пошукам недапалкаў у бляшанцы з-пад кавы. Больш удала ў «адысаў» выходзяць песні на адвечныя тэмы — смерць, каханне, шчасце, дзеці. «Шифроваться» — альбом надзвычай станоўчай музыкі з любоўю зробленай і са шчырасцю пададзенай. Застаецца толькі шкадаваць, што не прадаецца кружэлачка ў дыскарнях.

### Аляксандр Саладуха

Всего лишь 50, Vigma, 2009



**А-а-а! О-о-о!**

Трыб'ют Саладуху ад працаўнікоў сцэны (бела)рускай з актыўным удзелам самога юбіляра. Укладальнікі дыску слухачоў вырашылі не шкадаваць — 15 трэкаў тут. Казачэнка, Сяроў, Мурамаў ды іншыя падзабытыя героі расійскамоўнай песеннай безгустоўнасці сыходзяць слінай.

Гэтую складанку варта прызнаць за найлепшы беларускі трэш-поп-дыск. Тут ёсць усё: непрыхаваны хрып, што шансонам завецца, няўмелы рэп з смешнымі дзявочымі ўсхліпамі, рэстаранныя гітарныя запілы і надумана душараздзіральныя балады. Асабліва ўдала пяецца ў Марыэль пра «царящие зелёные глаза» (а-а-а!). Сам Саладуха таксама не дае засумаваць, выводзячы «Каліна-каліна, цвіла, цвіла» (о-о-о!). Выконваюць песні з рэпертуару 50-гадовага спевака ў асноўным людзі маладыя, вядомыя з жорсткіх тэле- і радыёратацый. Мог бы ўпрыгожыць праект спеў Кулінковіча пра чужую-мілую, але мікрафон далі толькі сваім. За выняткам нейкай па-дзіцячаму добрай і наіўнай песенькі пра «Заварожаную фею» ў выкананні нью-Верасоў і больш-менш уежнага напеву для тых, каму за трыццаць — «Сотни километров» дуэту Саладуха-Драздова, рэй тут вядзе каласальная безгустоўнасць і адсутнасць уяўлення пра сучасную музыку.

**Сяргей Будкін**



# Усходні фарпост

**Орша—Ляўкі—Копысь—Александрыя: маршрут, на якім можна пабачыць выдатныя помнікі архітэктуры і сведкаў гісторыі. Піша Сяргей Харэўскі.**

Агляд Оршы трэба пачынаць з Замчышча. Цяпер на ім ёсць адмысловая пляцоўка з памятным знакам, адкуль раскрываюцца самыя цікавыя віды на горад. Шэсць гадоў таму проста ў гародах пад гарой у 2-м Замкавым завулку былі, нарэшце, знойдзеныя магутныя падмуркі з валуноў першага тутэйшага замка. Знойдзеныя былі ў тых замкавых мурах кераміка, кулі, стрэлы і жалезнае ядро. Магутны быў замак: досыць ускараскацца на стромы вал і агледзецца.

А яшчэ на Оршу файна глядзець з Дняпра, з чаўна: упартая плынь, старыя дамы, чароды агародаў, манастырскія муры Куцейны, суток з Аршыцаю... Гледзячы на крутыя дняпроўскія берагі, разумееш дух гэтага месца, што паўстала на ўрадлівай зямлі на скрыжаванні старых гандлёвых дарог. Адсюль паходзяць старадаўняе «Аршанскае Евангелле» і ўнікальны «Аршанскі кодэкс».

Тут дзеялі дзесяткі велічных праваслаўных і каталіцкіх храмаў, кляштары бернардзінцаў, францішканаў, кармелітаў, дамініканаў, бенедыктынцаў, брыгітак, марыявітак, трынітараў, базыльянаў. Але несупынныя войны з Масквою перыядычна зводзілі амаль на нішто даробак аршанцаў. З 5 тыс. жыхароў Оршы ў 1772 г. засталося ўсяго 793 чалавекі...

Дзіўна бачыць у сучасным горадзе сведчанні сівое мінуўшчыны: шыкоўны кляштар дамініканаў з касцёлам Язэпа, два манастыры на Куцейне, узноўленыя ў апошнія гады, самы стары кляштар бернардзінцаў у стылі барока, дзе цяпер бальніца, але надзіва ў добрым стане, дзе ў калідорах можна ўбачыць крыжовыя скляпенні ды мудрагелістых абрысаў атворы арак на лесвіцах. Яшчэ цэлыя кляштар францішканаў, вялікі базыльянскі манастыр... Зіхціць залаты купал адноўленага езуіцкага калегіуму...

Пад вокнамі дома, дзе калісь жыў Уладзімір Караткевіч, стаіць цяпер бронзавы «Нулявы кіламетр», які ўпрыгожыў старадаўні магдэбургскі герб Оршы... У доме, дзе некалі быў раддом, цяпер музей Караткевіча, а недалёка і сімпатычны Прыдняпроўскі парк, а за ім ізноў суплёт старых вуліц, што то ўздымаюцца, то спускаюцца да вады...

### Смаляны

Орша пасля «Дажынак» выглядае фарсіста, а вось большасць вёсак закінутыя. У Смалянах стаіць занядбаная царква Святога Аляксея і вялізарны, велічны нават у сваім занядбанні касцёл дамініканцаў. На ўскрайку мястэчка віднеецца аскабалак шыкоўнага ў свой час замка Сангушкаў. Замак атрымаў назву Белы Ковель у гонар княскага котлішча Сангушкаў ва Украіне. Рэнесансавая ляпніна вакол колішніх комінаў засталася напамінам пра лепшыя часы. Белы замак разбурылі яшчэ трыста гадоў таму, у час Паўночнай вайны, і ў XIX стагоддзі канчаткова прадалі на цэглу. Ад тае пары смалянскі замак застаўся самай велічнай на Усходняй Беларусі рамантычнай руінай. Над панарамай Смалянаў цяпер пануе вялікі драўляны Спасаўскі храм. Гэта ўнікальная царква ў духу барока: яе купал трымаюць вялізарныя драўляныя калоны, вычасаныя з цэльных сасновых камлёў. А літаральна пару гадоў таму ў сутарэннях, пад драўляным храмам, быў знойдзены падземны, мураваны храм, які цяпер аднаўляюць. Яго катакомбная простасць і дзіўны светлавы эфект, які ствараюць акенцы, робяць моцнае ўражанне. Як і старыя абразы, якія тут ацалелі. На смалянскіх каталіцкіх могілках захавалася магіла Тамаша Зана, прыяцеля Міцкевіча, слыннага рамантыка пачатку XIX стагоддзя.



**Абразы XVII ст. пад купалам смалянскай царквы.**

### Ляўкі

Па дарозе з Оршы ў Копысь варта наведацца ў Ляўкі. Тут меў дачу Янка Купала. Ён атрымаў гэтую лесьнічоўку ў 1935 г. ад урада БССР. Сам Купала запраектаваў хату, пабудаваную на беразе Дняпра. З акон дачы раскрываюцца такія далягляды, што аж дух займае. Супрацоўніцы апавядаюць: у музеі стаіць стары чорны «Шэўрале» паэта, а выдатны помнік Купалу быў створаны Анатолем Анікейчыкам ў бясконца, здаецца, далёкія ўжо 1970-я... Дняпро тут чысты. Хто не акунаўся ў халодныя Дняпровыя воды тут — не бываў, лічы, у Ляўках...

### Копысь

А вось і летапісная Копысь, якая стала вядомай на ўвесь свет нечакана. Як і нечакана ў нашым свеце шмат чаго робіцца. Тут нарадзіўся Лукашэнка. Дзякуючы гэтай акалічнасці, дарога ад Оршы сюды — проста ручнічок. Копысь стала відным турыстычным цэнтрам Беларусі!

Першы горад тут паўстаў яшчэ ў Сярэднявеччы. Радзівілаўская Копысь была буйным цэнтрам Рэфармацыі, мела вялікі кальвінскі збор і бібліятэку. Найбольшая памятка ў мястэчку — велізарнае гарадзішча.

Пацікаўцеся чорнымі зайцамі, што некалі вадзіліся тут у мностве і нават патрапілі на гарадскі герб.

Пацікаўцеся і тутэйшай керамікай. Капыскія майстры робяць выдатныя збаны і гладышы — добры ўспамін пра край над Дняпром.

### Александрыя

З копыскага замчышча адкрываецца від на задняпроўе, на вёску Александрыя. Там, на выселках, рос Лукашэнка. Адвеку паселішчы злучаў паром, але нядаўна на прэзідэнцкую радзіму паставілі мост. А месца, дзе стаяла хата Лукашэнкаў, адзначылі альтанкай.

Александрыя выглядае сёння як нямецкі бург, перанесены за тысячу кіламетраў на ўсход. А можа як пацёмкінская вёска, якія акурат уздоўж Дняпра ставіў калісьці святлейшы князь? Скончыце сваё падарожжа павучальным наведваннем гэтага мілага астраўка шчаслівае будучыні.

**Орша**

вялікі горад з вялікай гісторыяй. Аршанскі замак збудаваў Вітаўт. У яго пакоях бяседаваў Канстанцін Астрожскі, святкуючы вялікую перамогу 1514 года. Аршанец Андрэй Кабыла, баярын аршанскі, у XIV ст., паехаўшы на службу ў Маскву, даў свае гены царскай дынастыі Раманавых.

З Оршы пісаў свае «Лісты» Філон Кміта-Чарнобыльскі — староста Аршанскі і ваявода Смаленскі. Пасля Кміты пасаду аршанскага старасты доўгі час займалі Сапегі. Адсюль рушыў Аршанскі харунжы, легендарны герой Самуэль Кміціч, правобраз Анджэя Кміцыца ў рамане Сянкевіча «Патоп».

У 1630—1650-я у Оршы пры Куцеінскім Богаяўленскім манастыры працаваў геніяльны друкар Спірыдон Собаль. Собаль выдаў у Оршы першы беларускі «Буквар», сам прыдумаўшы гэтае слова, вядомае цяпер усім усходнім славянам з маленства.

А ў 1812-м інтэндантам Оршы імператар Напалеон прызначыў Анры Мары Бэйля, вядомага ў свеце як Стэндаль, класіка еўрапейскае літаратуры, які знайшоў тут і сваё каханне.

У 1813-м сюды прыехаў геніяльны Іван Насовіч, выбітны лексікограф, стваральнік першага класічнага «Слоўніка беларускай мовы». Тут ён працаваў настаўнікам і інспектарам Аршанскага духоўнага вучылішча. На жаль, ніводнаму з сузор'я гэтых зорных постацяў у Оршы помнікаў пакуль няма. Толькі Собалю ёсць прыгожая шыльда на адрэстаўраванай царкве ў Куцеінскім манастыры. Затое ў Оршы ёсць помнікі Леніну і Гуліверу з карузлікам.

Ёсць у Оршы і помнік Караткевічу. Апроч Караткевіча, адсюль родам мастак Мікола Купава, лідэр Хрысціянскай дэмакратыі Павал Севярынец і, з другога боку, колішні старшыня КДБ, Леанід Ерын. Каму паставяць помнікі нашчадкі?



# За што мы (не) любім Анджаліну Джолі?

**Усынаўленні–ўдачкаванні, Брэд Піт, пафасная акторская ігра, Білі Боб Торнтан. Мы вырашылі скарыстаць 34–ы дзень народзінаў Анджаліны Джолі, каб зразумець, чаму мы любім яе і ў адначассе так любім ненавідзець. Пяць рэчаў, якія нам падабаюцца ў кіназорцы, і пяць, якія не.**



### Чаму нам даспадобы Анджаліна Джолі?

1. Бо яна — шчырая душа. Пасол добрай волі ў ААН. Ёй сапраўды баліць за галодных дзетак у свеце, ды яна пераводзіць процьму грошай на дабрачыннасць.

2. Бо яна такая прыгожая, а некаторыя скажуць, што нават дасканалая. Вось прыгадайце, калі вы ўпершыню яе пабачылі: вочы, вусны, грудзі, спакуслівая ўсмешка... Не так ужо шмат жанчын, якія столькі разоў займалі месца самай зваблівай і пекнай жанчыны планеты.

3. Удачкаваныя і ўсыноўленыя дзеці. Мы яшчэ не ведаем, як будуць выглядаць яе будучыя блізняты, але наяўныя, усыноўленыя — такія зорачкі ясныя! Ну як такая мама можа быць зненавіднай знакамітасцю?

4. Красуня мае «Оскара», што сведчыць пра яе адоранасць і пра тое, што яна стараецца, працуе над сабой. Любіць дзяцей і любіць працаваць, а, на нашу думку, спалучыць кар'еру і сям'ю — несумненны поспех.

5. Брэд Піт. Звяла яго, не звяла — якая розніца! Ён што, бычок нейкі?! Галоўнае, што цяпер яны — звышпара, і мы, у прынцыпе, не вінавацім ні Энджы, ні Брэда. Ёсць адчуванне, што злучыла іх якраз найвышэйшая воля. І варта зацеміць, што Джолі абрала роўню: красунчыка, не дурнога і не без таленту. У дадатак гэта яскрава кажа, што Анджаліна ясна ўсведамляе сваю прыгажосць.

### Чаму мы любім ненавідзець Анджаліну Джолі?

1. Даражэнькая, можа хопіць гэтых паказушных паездак па добрай волі, з дапамогай бліжняму і г.д.?! Чалавецтва вас ужо і так палюбіла. Выглядае пафасна, прыблізна як ваша ж акторская гульня (а да яе мы яшчэ дойдзем). Праўда, Анджаліна ахвяруе вялікія сумы, але чаму інфармацыя пра гэтыя грашовыя пераводы трапляе ў кожную газету? Мільёны людзей штодня робяць ахвяраванні, і ніхто не піша пра іх. Чаму Анджаліна павінна абавязкова публічна паведаміць, што гатовая сфатаграфавацца з блізнятамі за шматмільённы ганарар, каб перавесці прыбыткі ад здымкаў на дабрачыннасць? Што, даражэнькая, ніколі не чула пра ахвяраванні ў сакрэце?

2. І хопіць іграць так пафасна. Ну і што, што атрымала «Оскара»?! Можа, тым годам іншыя былі проста горшыя? Анджаліна, будзьце прасцейшай, і да вас пацягнуцца людзі.


Брэд Піт і Джэніфер Аністан.

3. Білі Боб Торнтан. Хай даруюць яго прыхільнікі, але што такая дзяўчына, як Анджаліна, рабіла побач з ім? І чаму трэба было насіць выбарку яго крыві ў медальёне? Што, на выпадак пераліцця крыві, калі яна чарговы раз зробіць татуяванку ці сваё ўлюбёнае шнараванне на скуры? І нават парнаграфічныя інтэрв'ю, якія яна шчодра пастаўляла прэсе, у якіх распавядалася, дзе і як яны з Торнтанам бавіліся сэксам. Варта зазначыць, што ўсе выбрыкі не дадалі ёй да жаданага іміджу «кепскай дзяўчыны», бо яны былі проста вартымі смеху. Цяпер маем, што маем: татуяванку можна памяняць ці звесці, а вось рэзюмэ — наўрад.

4. Брэд Піт і Джэніфер Аністан. Ведаеце, спадарыня Джолі, такіх? Яны былі галівудскай парай серыі «Най»: найпрыгажэйшыя, найпрыемнейшыя, пакуль вы, спадарыня Джолі, не вырашылі прысабечыць палоўку гэтага Брэ(н)да. Яму таксама, канешне, трэба надаваць па галаве, але гэта ўсё ж ваш дзень нараджэння. І не спрабуйце сказаць, што вы пачалі сустракацца з ім пасля таго, як шлюб распаўся, бо ў вас жа самой вырвалася, што тое здарылася да разводу. А кожная жанчына засведчыць, што гэта ўжо занадта.

5. Увага! Для тых, хто прыбыў толькі што: Анджаліна Джолі абышла на круг саму Опру Уінфры, калі, паводле часопісу «Форбс», была абраная самай «моцнай знакамітасцю». Ой, сапраўды, яшчэ адзін недарэчны напышлівы тытул — толькі гэтага нам бракавала! Але: абысці саму Опру, якую мы любім ненавідзець яшчэ больш, дае Анджаліне сякую-такую перавагу.

І нават калі пасля гэтага ўсяго вы, шаноўныя, так і не сфармавалі ўласнае меркаванне наконт Анджаліны Джолі, ці вам проста нецікава, усё роўна пагадзіцеся, што гэтае дзяўчо цяжкавата не заўважыць, і так ці інакш яна вартая, каб яе павіншаваць з днём народзінаў.

**Лізавета Кавальчык**

# Шэрлак Холмс у Горадзе Анёлаў

**Галівуд здымае два новыя фільмы пра Шэрлака Холмса.**



Шэрлак Холмс па-ранейшаму адзін з найвядомейшых літаратурных сышчыкаў на планеце. Конан-Дойль, 150-годдзе з дня нараджэння якога адзначаецца сёлета, стварыў вобраз, які па-ранейшаму натхняе многіх, а пагатоў галівудскіх кінасцэнарыстаў, то бок тых, хто спакон веку стрыг купоны з экранізацыяў вядомых літаратурных твораў.

Колькасць пародый на шэрлакхолмсаўскія сюжэты ў кіно дараўноўвае колькасці сур'ёзных фільмаў па кніжках Конан-Дойла. Першы замах на класічны (люлька, кепі і поўная адсутнасць рамантычных сувязяў) вобраз Шэрлака Холмса адбыўся ў 1939 г. Самі брытанцы, незадаволеныя запрыстойнай віктарыянскай спадчынай, знялі некалькі фільмаў з Базылам Рэтбарнам. Яго герой дзейнічае ў сярэдзіне XX ст. і маляўніча глядзіцца побач з новымі апанентамі, зламыснікамі-нацыстамі. У Беларусі гэты чорна-белы міні-серыял круцілі на пачатку 1990-х.

У савецкім кіно, праз пару гадоў гадоў пасля з'яўлення «найлепшага Шэрлака Холмса ўсіх часоў і народаў», прыгожатэмбравага Ліванава, з'явілася эмансіпэ-стужка «Мой пяшчотна каханы дэтэктыў». Дзве яе галоўныя гераіні — Шэрлі Холмс і місіс Ватсан.

Неўзабаве пасля таго, як лонданскі сышчык паказаў свой рымскі нос у Галівудзе, на яго зрабілі фільм-пародыю «Без адзінай зачэпкі» (1988 г.) з Майклам Кейнам (нядаўна ён граў лёкая Альфрэда ў «Бэтмэне» ). І там усё перастаўлена месцамі: таленавіты сышчык, выдатны літаратар і фенаменальны піярмэнэджэр Ватсан наймае актора, п'янюку і скандаліста, раскручваць Ватсанаўскія кнігі. Але прафесар Марыярці выкрадае Ватсана. І бесталковаму, але, у адрозненне ад Ватсана, шчыраму і дзесьці нават станоўчаму Холмсу, даводзіцца, ратуючы свайго стваральніка, самастойна перамагаць злачыннага прафесара.

І сёлета ў горадзе Анёлаў, Лос-Анжэлесе, зноў кіпіць праца, каб чарговы раз дастасаваць вобраз Холмса да кіно. Ведома, на фоне ў кадры будуць знакамітыя «кацялкі» і каптуркі віктарыянскай эпохі, але як выглядацьме сам геній вышуку?

### Шэрлак Бонд

Першую стужку ставіць Гай Рычы, стваральнік жорсткага «Карты, грошы, дзве рулі». У яго фільме «Шэрлак Холмс» галоўную ролю грае Роберт Даўні-малодшы. Джуд Ло прыкідвае на сябе гарнітур доктара Ватсана. Фільм пастаўлены хутчэй не паводле Конан-Дойлевых твораў, а па вытворнай: за аснову ўзяты графічны раман Лаёнэла Віграма. І гэта не адзінае нававўвядзенне. Дзядзька Холмс прадстаўлены не меншым жыгала, чым Джэймс Бонд. Сышчык заўсёды гатовы (як прынята ў XXI ст.) кінуцца ў галавакрутны экшн. Ён не толькі выкрывае злачынствы, але і ганяецца за злачынцамі, дзякуючы натрэніраваным цяглiцам, не забываючы прадэманстраваць іх (на зайздрасць бялявай шэльме Даніэлю Крэйгу). А свае адносіны Холмс **(на фота)** і Ватсан цяпер высвятляюць не ля каміна, а на баксёрскім рынгу.

### Шэрлак Холмс з Алма-Аты

Другі фільм цікавы не менш. Ён пакуль толькі здымаецца, а яго сюжэт не надта вядомы. Вядома адно: вобраз сышчыка будзе ўвасабляць (валіцеся адразу!) Саша Барон Коэн, ён жа прасунуты цемрашал, казахскі журналіст Борат. Нас чакае напраўду балаганнае відовішча: цынічны, з'едлівы і вульгарны Коэн не перапусціць, каб не пастроіць кепікі з усяго і ўсіх, падпусціць непаліткарэктныя жарцікі, выкачаць у гразюцы свайго ж героя. Не менш камедны Віл Фэрэл («Зуландэр») будзе на падхваце ў ролі Ватсана. Цікава, як цяпер павінна гучаць праграмная фраза сышчыкавага брата Майкрафта Холмса: «Пазнаёмцеся, гэта мой брат Шэрлак Холмс»? Няўжо: «Пазнаёмцеся, гэта мой брат... Борат».

**Ліза Кавальчык**

# Ахвяры бяздарнага рэжыму

Мінск у першыя дні вайны ва ўспамінах відавочцаў. Піша **Алег Дзярновіч**.

Пачатак вялікай вайны ў Мінску сустрэлі амаль будзённа. У нядзелю, 22 чэрвеня 1941 года, прыйшло цудоўнае сонечнае надвор'е. Паводле ўспамінаў сведкаў падзей, мала хто з гараджанаў звяртаў увагу на аддаленыя гукі выбухаў — усе прызвычаіліся да вайсковых вучэнняў і вучэбных трывог.

У гэты дзень маскоўскі МХАТ у найлепшай тэатральнай зале Мінску, у Доме Чырвонай арміі, даваў дзённы спектакль «Школа зласлоўя» паводле Шэрыдана. Спектакль пачаўся а 12-й. Пасля антракту, калі гледачы наладзіліся на другі акт, паднялася і адразу апусцілася заслона. На авансцэну выйшаў чалавек у вайсковай форме і будзённым голасам заявіў, што на савецкую краіну вераломна напала фашысцкая Германія. Пасля ягоных словаў у зале наступіла ціша. Вайсковец упэўненым голасам заклікаў да спакою, каротка паведаміў пра выступ па радыё Молатава і папрасіў не панікаваць.



Калона ваеннапалонных на мінскай вуліцы. Першыя дні вайны.

## Ніхто не інфармаваў, што рабіць

У панядзелак, 23 чэрвеня, трамвай, асноўны гарадскі транспарт, з'явіўся на вуліцах своечасова, і гэта ўпарадкавала гарадское жыццё. Ноч прайшла спакойна, але на світанку зноў пачуліся ўжо блізкія выбухі бомбаў.

Многія людзі ведалі, што ў новабудоўлях маюцца бамбасховішчы. Ужо ў першую ноч некаторыя заначавалі там. Таксама частка насельнікаў драўляных дамоў перабралася да сваякоў ці сяброў у мураваныя будынкі, якія падаваліся больш надзейнымі. Паветраныя налёты на трэці дзень развеялі гэтыя ілюзіі. Як прыгадвае ў сваіх нататках мінчанка тых гадоў Ася Адам, цагляныя дамы, што ўзвышаліся над наваколлямі, абрынуцца першымі пад ударамі невялікіх бомбаў, а драўляныя хаціны і нават халупы на ўскраінах застануцца цэлымі.

Гарадскія ўлады ніяк сябе не праяўлялі, хіба што па радыё перыядычна рэкамендавалі не паддавацца паніцы.

Раніца трэцяга дня пачалася з паветранай трывогі, але гараджанам па-ранейшаму не было зразумела, што рабіць. Трамваі ездзілі, работнікі дысцыплінавана кіраваліся на працу. Іншыя спрабавалі займацца паўсядзённым клопатам.

Але хутка ад няпэўнасці не засталося і знаку — на Мінск абрынуўся шквал бомбавых удараў. Відавочцам падавалася, што бамбаванне мэтанакіравана вялося па жылых дамах — усе значныя новыя ўрадавыя будынкі ацалелі.

Арганізаваных дзеянняў па эвакуацыі не было. Відавочна, паніка ахапіла і кіраўніцтва. Разгубленасць начальства тлумачылася таксама тым, што ў яго складзе пасля вынішчальных рэпрэсій было шмат новых людзей, не так даўно прысланых з цэнтральных раёнаў Расіі. Яны так і не паспелі асвоіцца з гарадской гаспадаркай.

## Начальства збегла першым

У гэты трэці дзень многія кіраўнічыя работнікі, скарыстаўшыся даручаным ім транспартам, вывозілі свае сем'і і хатні пажытак. Некаторыя начальнікі наўпрост казалі: «Прадпрыемства больш не існуе, я ўжо больш не дырэктар, рабіце так, як ведаеце». Трэба сказаць, што ў людзей, выхаваных на безумоўным падпарадкаванні начальству, такія словы нараджалі пачуццё безвыходнасці.

Тут ужо пачалі ратавацца, як хто мог. Гараджане кідалі жытло і маёмасць. Хутка вызначыўся агульны кірунак уцёкаў ад бамбёжак: на ўскраіны, у лес. На ўсходніх ваколіцах Мінска сабраўся вялікі бязладны натоўп, які быў добра бачны нямецкім пілотам — і тыя адкрылі кулямётны агонь па паражэнне.

Кіраўніцтва, міліцыя, служба бяспекі і нават кіраўнік грамадзянскай абароны пакінулі горад за тры дні да заняцця яго немцамі.

У той жа час невялікімі групкамі ў Мінск з усходу накіроўваліся марадзёры. Пасля бамбёжак кватэры гараджанаў рабаваліся.

У такіх сітуацыях трагічнае часам перапляталася з камічным, і наадварот. Сям'я аднаго савецкага работніка, па якую быў дасланы аўтамабіль, у той жа дзень вярнулася з паловы шляху па цешчыну швейную машынку. Калі зноў сабраліся ехаць, аўтамабіль быў канфіскаваны вайскоўцамі. Сям'я з двума маленькімі дзецьмі вымушаная была застацца і перажыла акупацыю, страціўшы з-за хваробы адно дзіця.

Паводле прызнання сведкаў, усё вышэйшае кіраўніцтва, міліцыя, НКДБ і нават кіраўнік грамадзянскай абароны разам са сваім штабам пакінулі горад за тры дні да заняцця яго немцамі. Ніхто нават не спрабаваў гасіць пажары.

## Лінія Сталіна стаяла без кулямётаў

У тыя самыя дні, 26 і 27 чэрвеня, у гіганцкім катле на захад ад Мінску ў акружэнні апынуліся савецкія 3-я і 10-я арміі амаль у поўным складзе. Паводле справаздачы нямецкага генерала фон Цыпельскірха, «у бітвах за Беласток і Мінск было ўзята ў палон 328 808 чалавек, у тым ліку некалькі высокапастаўленых генералаў, захоплена 3332 танкі, 1809 гармат і шмат іншых трафеяў».

Нямецкая група арміі «Цэнтр», якая прасоўвалася праз Беларусь, значна саступала Чырвонай арміі ў танках (мела іх 1800), прайгравала таксама ў самалётах (1680 супраць 1789). Але небывалы поспех нямецкай авіяцыі, якая ў першы дзень вайны знішчыла на аэрадромах, а таксама ў паветры, 739 баявых савецкіх самалётаў, значна паспрыяў прасоўванню войскаў Вермахту.

У сваіх успамінах, апублікаваных яшчэ ў 1966 г., генерал-палкоўнік Леанід Сандалаў прыгадвае ролю ў тых баях умацаваных раёнаў, названых пазней «лініяй Сталіна». Начальнік штаба 4 арміі палкоўнік Сандалаў у шляху на Слуцк патрапіў у затор. Ідучы ўздоўж калоны, ён чуў размовы жаўнераў:

«— Ну, хутка канец нашым пакутам. Затрымаемся ва ўмацаваным раёне, і тады немцы ўткнуцца ў яго мордамі.

— А дзе ён ёсць, гэты раён умацаваны?...

— Яшчэ вясной вывезлі адтуль усе гарматы і кулямёты.

На момант запанавала цішыня...

— Ну што ж, вывезлі, значыць, вывезлі... Значыць, так трэба было».

28 чэрвеня ў паўднёвыя ўскраіны Мінску ўвайшла 17-я танкавая дывізія з групы генерал-палкоўніка Ганса Гудэрыяна.

Гісторыкі адзначаюць, што падзенне Мінску і заняцце тэрыторыі ўсёй Беларусі было не толькі вайсковай паразай, але і спарадзіла палітычны крызіс. Менавіта ў тыя дні Сталін адышоў ад сваіх абавязкаў і, рыхтык мінскае начальства, выехаўшы з Крамля, схаваўся на дачы ў Кунцаве. Быў момант, калі ў Савецкім Саюзе магла змяніцца сістэма ўлады, якую з вялікай цяжкасцю ўдалося ўтрымаць верным Сталіну членам Палітбюро. У далейшым у гады вайны ў такіх маштабах крызіс ужо не паўтарыўся.

**25 чэрвеня 1941 г. Зусім сакрэтна. ЦК ВКП(б) тав. Сталіну. ЦК КП(б) Беларусі тав. Панамарэнка. Дакладная запіска сакратара Брэсцкага абкаму КП(б)Б М.Тупіцына**

У Брэсцкай крэпасці на самай мяжы трымалі дзве дывізіі, якім нават у мірны час патрабавалася шмат часу для таго, каб выйсці з гэтай крэпасці і разгарнуцца для ваенных аперацый. Нягледзячы на сігнал ваеннай небяспекі, камандны склад жыў у горадзе на кватэрах. Натуральна, з першымі стрэламі сярод чырвонаармейцаў утварылася паніка.

**Паведамленне сакратара Лунінецкага райкама КП(б)Б В.Анісімава ў Наркамат шляхоў зносін СССР пра стан на Пінскім кірунку. г. Лунінец. Не пазней за 30 чэрвеня 1941 г.**

У горадзе поўна камандзіраў і чырвонаармейцаў з Брэста, Кобрына, якія не ведаюць, што ім рабіць, бесперарыўна прасоўваюцца на машынах на ўсход без усякай каманды.

...У Пінску самі ў паніцы падарвалі артсклады і нафтабазы і аб'явілі, што іх бомбамі падарвалі немцы.

...Шлюць самалёты ў разабраным выглядзе, а сабраць іх няма дзе. Будзем вяртаць назад. Нам паказваюць нейкую невытлумачальную расхлябанасць.

**Тэлеграма сакратара Гомельскага абкама КП(б)Б Ф.Жыжанкова І.В.Сталіну. Гомель. 29 чэрвеня 1941 г. Зусім сакрэтна.**

Бюро Гомельскага абкама інфармуе Вас пра дэмаралізуючыя паводзіны вельмі значнае колькасці каманднага складу: сыход з фронту камандзіраў, групавыя ўцёкі раскладаюць насельніцтва. ...27 чэрвеня група калгаснікаў Карналінскага сельсавета Гомельскага раёна затрымала і абяззброіла групу вайскоўцаў каля 200 чалавек, якія пакінулі аэрадром, не пабачыўшы праціўніка, і кіраваліся ў Гомель.

**Дакладная запіска сакратара Брэсцкага абкама КП(б)Б Т.Новікавай сакратару ЦК КП(б)Б Г.Эйдзінаву. Гомель, 19 ліпеня 1941 г.**

З горада адступалі неарганізавана. У 7—7 1/2 ч. ранку сыходзілі камуністы з абкама партыі.

...У дарозе пад Слуцкам застрэленыя члены ВКП(б) т.Трафімаў — нач. аддзела абл. упраўлення НКГБ, супрацоўнік т.Курусь і нач. Брэсцкага РА НКГБ т.Яршоў; яны былі прынятыя за дыверсантаў і застрэленыя нашым атрадам.

**Дакладная запіска лектара Брэсцкага абкама КП(б)Б С.Іофэ ў ЦК КП(б)Б. Гомель. Не пазней за 19 ліпеня 1941 г.**

Знаходзячыся ў гарваенкамаце, мы назіралі, як з дамоў Беластоцкай вуліцы невядомыя людзі адкрылі ружэйны і кулямётны агонь па адыходзячых нашых вайсковых частках.

Выбіўшы шыбу і пераскочыўшы плот, мы апынуліся на іншай вуліцы. Па горадзе шныпарылі нямецкія салдаты. Я і карэспандэнт газеты «Октябрь» т.Рыўкін забеглі ў лёхі кінатэатра імя Горкага. Да 29.VI я, чакаючы Чырвоную Армію, хаваўся. Начаваў у сінагозе, паветцы. Быў сведкам, як пад выглядам росшуку зброі нямецкія салдаты рабавалі насельніцтва, пераважна забіралі боты, штаны, гадзіннікі, пасцельную бялізну. Адзін салдат падышоў да рабочага друкарні і загадаў яму тут жа зняць ягоную рэпсавую кашулю. Салдаты забівалі без дай прычыны. Расстраляны 18–гадовы юнак–яўрэй, які жыў на вул.Пятроўскага, толькі за тое, што зайшоў у свой дом, калі там немцы рабіліператрус.

**Моцна скарочана. Архіўныя дакументы цалкам апублікаваныя журналістам Сяргеем Крапівіным на naviny.by. Да такіх запісак трэба, безумоўна, ставіцца крытычна: іх аўтары, натуральна, імкнуліся паказаць сябе ў выгадным святле. Аднак з іх паўстае непрыхарошаная карціна рэаліяў, у якіх вялізная краіна, што па сваім чалавечым і сыравінным патэнцыяле нашмат пераўзыходзіла Нямеччыну, сустрэла вайну.**

# Самае масавае свята ліпеня

## 1 і 2 ліпеня ў Будславе, на Мядзельшчыне, адбываецца фэст у гонар Маці Божай Будслаўскай, Апякункі Беларусі.

Гісторыя Будслаўскай святыні пачынаецца з 1504, калі вялікі князь літоўскі Аляксандр падарыў паселішча Буда віленскаму кляштару бернардынцаў. Браты-бернардынцы раскарчавалі кавалак пушчы на ўзбярэжжы ракі Сэрвач і ў 1530 паставілі там невялікую драўляную капліцу.

У канцы XVI ст. у Будславе ўжо існавалі касцёл і кляштар бернардынцаў. Тады ж з’явіўся і славуты абраз Маці Божай. Спачатку ён належаў мінскаму ваяводу Яну Пацу. Ваявода прывёз яго з Рыма — як падарунак ад Папы Клімента VIII, пасля пераходу з кальвінізму ў каталіцтва. Пац вельмі шанаваў абраз і заўсёды вазіў з сабою. Пасля смерці ваяводы святыня перайшла да яго капелана. А той, у сваю чаргу, ахвяраваў яе касцёлу.

Першыя цуды абраза Маці Божай Будслаўскай былі апісаныя манахам кляштара Элеўтэрыем Зеляевічам у кніжцы «Задыяк на зямлі» (Вільня, 1650). Першы цуд быў зафіксаваны ў 1617, калі да пяцігадовага сляпога хлопчыка Язапата Тышкевіча вярнуўся зрок. Пазней гэты хлопчык стаў вядомым ксяндзом-кармелітам. У той жа дзень Рэджынальд Тышкевіч пазбавіўся ад падучай хваробы, на якую ён хварэў сем гадоў. Зеляевіч апісвае, што сцены драўлянага касцёла былі заклееныя сотнямі паперак з просьбамі да Маці Божай Будслаўскай.

Да сярэдзіны XVII ст. на месцы драўлянага паўстаў невялікі каменны касцёл. Для змяшчэння цудатворнага абраза майстра Пятро Грамель у 1649 стварыў разьблёны алтар. А бернардынцы-злотнікі Геранім Плонскі і Бенедыкт Росман вырабілі срэбраныя аздобы для іконы — аклад і ажурную раму.

У 1767 быў закладзены першы камень новага касцёла. Велічная базіліка паўстала за 16 гадоў. Першы, стары касцёл, не зносілі: ён застаўся ў выглядзе бакавога памяшкання храма, у яго можна патрапіць праз дзверы з тыльнага боку вялікага храма. Патрапіць, нібы ў іншую архітэктурную эпоху. З прыземістымі скляпеннямі, галовамі грубавата-сярэднявечных анёлаў на сценах. У малым касцёле і сёння месціцца той драўляны, чорны з золатам, з фігурамі святых, алтар.

Да сярэдзіны XIX ст. Будслаўскі кляштар быў асяродкам не толькі духоўным, але і асветніцкім. Пры кляштары дзейнічала пачатковая школа, музычная школа, быў і шпіталь для бедных.

У 1858 новая ўлада зачыніла кляштар. Кляштарныя будынкі пасля здушэння паўстання Каліноўскага былі перададзеныя царскім войскам, а пасля зусім разабраныя. Застаўся толькі велічны касцёл.

Яго штодня бачылі вучні першай беларускай гімназіі, створанай у Будславе ў 1918, яго вежы, высока ўзнятыя над навакольнымі лясамі, пэўна, сніў у Канадзе Старшыня Рады БНР Вінцэнт Жук-Грышкевіч, народжаны ў Будславе.

За польскім часам будынак касцёла актыўна рэстаўравалі і абнаўлялі. Колькасць вернікаў у парафіі дасягнула сямі тысяч чалавек. Шырылася і традыцыя фэсту. На 1 і 2 ліпеня ў Будслаў з’язджаліся тысячы паломнікаў усіх канфесій. Пазней, у савецкі час, касцёл не перапыняў дзейнасці. Ніводная спроба сталіністаў узарваць касцёл не атрымалася. А замах мясцовага сельсаветчыка на цудоўны абраз Маці Божай, кажуць людзі, скончыўся для яго вар’яцтвам і хуткаю гвалтоўнаю смерцю.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Хоць цемрашальства святыня паспытала. Калі ў 1990-я з іконы Маці Божай знялі аклады, каб рэстаўраваць, пабачылі, што яна ў некалькіх месцах прабітая, прастрэленая і нават прапаленая.

Традыцыя пілігрымак у Будслаў аднавілася за незалежнасцю, на пачатку 1990-х. Ад таго часу тысячы вернікаў з Беларусі і ўсяго свету прыходзяць да касцёла пакланіцца абразу Нябеснай Апякункі Беларусі. Фэст у Будславе зрабіўся самым велічным, урачыстым і, зрэшты, самым беларускім святам краіны.

Кульмінацыяй фэсту з’яўляецца ўрачыстае шэсце з цудатворнай іконай. Дзесяткі тысяч людзей з запаленымі свечкамі абыходзяць цэнтральную плошчу мястэчка і вяртаюцца да касцёла. Нібы жывая вогненная рака плыве перад велічнай базілікай. Гэта прыгожы і велічны момант, які абавязкова трэба пабачыць на свае вочы, каб адчуць гісторыю і ўрачыстаць свята Маці Божай Будслаўскай.

**Настасся Шамрэй**

**27 чэрвеня ў Будслаў рушыць пілігрымка з Мінска** (ідзе 5 дзён). Пасля ранішняй святой Імшы (8.00) у Катэдры, літургіі і благаслаўлення біскупа вернікі выходзяць у працэсіі і ідуць вуліцамі Мінску ў напрамку Мядзела. З Чырвонага касцёла пойдзе пакутная пілігрымка (удзельнікі групы на працягу ўсяго шляху захоўваюць сціслы пост — хлеб і вада), а астатнія — з архікатэдры.

Таксама **дабрацца да Будслава можна будзе аўтобусамі ад Чырвонага касцёла 1 і 2 ліпеня.** 1 ліпеня — выезд у 17.00 і 19.00 (кошт 25 000). 2 ліпеня — выезд у 06.30 (кошт 20 000). Падрабязная інфармацыя і запіс на пешую і аўтобусную пілігрымкі праз т.: (017) 200-44-15.

**Таксама ў Будслаў ідуць пешая пілігрымка з Баранавіч** (9 дзён), **з Віцебскай дыяцэзіі** (8 пешых груп і 1 група на роварах, агульная колькасць удзельнікаў — 1600 вернікаў).

**Самая доўгая пілігрымка ў Будслаў — з Брэста.** Яе ўдзельнікі ідуць 16 дзён. Працягласць трасы складае 500 км.

Летась у санктуарый прыбылі каля 3 тысяч пешых пілігрымаў. Усяго ва ўрачыстых набажэнствах ўзялі ўдзел каля 30 тысяч вернікаў.

## Расклад урачыстасці

### 1 ліпеня, серада:

**12.00—17.00** — Сустрэча і прывітанне пілігрымаў
**18.00** — Святая Імша для пілігрымаў (цэлебруе біскуп Уладзіслаў Блін)
**24.00** — Кульмінацыя ўрачыстасці — працэсія са знічамі вакол Краснай плошчы. Сустрэча абраза Езуса Міласэрнага і рэліквій благаслаўлёнага кс. Міхала Сапоцькі. Святая Імша (цэлебруе арцыбіскуп Тадэвуш Кандрусевіч)

### 2 ліпеня, чацвер:

**2.00** — Моладзевая праграма (музычная праграма у палатачным мястэчку)
**2.00** — Святая Імша ўсходняга абраду, Акафіст (спявае хор Грэка-каталіцкай Царквы)
**4.00** — Адарацыя Найсвяцейшага Сакраманту (у базыліцы)
**6.00** — Святая Імша перад абразом Маці Божай (цэлебруюць айцы бернардынцы)
**10.30** — Святая Імша (цэлебруе кардынал Казімір Свёнтэк).Выстаўленне Найсвяцейшага Сакраманту, працэсія. Гімн «Te Deum laudamus»
**13.00** — Святая Імша (на польскай мове; цэлебруе біскуп Аляксандр Кашкевіч)

## Купалле

Купалле — адно з найзначнейшых традыцыйных святаў беларусаў. Сёлета ёсць праграма і для тых, хто хоча на Купалле застацца ў сталіцы, і для тых, каму карціць выехаць «на прыроду».

**26 чэрвеня ў клубе «Рэактар» у 18.00** адбудзецца фестываль фолк/метал музыкі «Купальскае кола». Атмасферу паганства і містычнасці створаць гурты **«Znich»**, **«Litvintroll»**, **«Пярэварацень»** (Беларусь), **«Культ»** (Украіна). Кошт квіткоў ад 15 да 25 тыс. руб. Першыя трыста пакупнікоў білетаў атрымаюць у падарунак дыск. Падрабязнасці праз т.: (029) 649-08-88.

Тым, хто хоча ўзяць удзел у старадаўніх абрадах, варта наведаць «Купальскі вечар» **у Музеі народнай архітэктуры**. Свята пачнецца **27 чэрвеня а 17-й**. У праграме: пляценне вянкоў, здабыванне «жывога агню», народныя гульні. Кульмінацыяй стане купальскае вогнішча. Арганізатары прапануюць наведнікам прыхапіць з дому старыя рэчы, ад якіх ёсць жаданне пазбавіцца. Кошт білета ад 3150 да 6300 рублёў. За дадатковую плату можна набыць сувеніры і наведаць карчму. Даведкі праз т.: (029) 697-89-01.

**Музей знаходзіцца за 4 кіламетры ад МКАД за аўтарынкам «Малінаўка» і вёскай Азярцо.** Праезд ад аўтастанцыі «Паўднёва-Заходняя» аўтобусамі №203, 262, 363, 277, 325, 357 — да прыпынку «Музей».

Эксклюзіўнае Купалле прапануе з 6 на 7 ліпеня мастак Алесь Пушкін. Адбудзецца яно ў вёсцы Бобр Крупскага раёну. У планах – “дызайнерскае” вогнішча з ведзьмай, аўтэнтычныя спевы, карагод і крупнік “а-ля Пушкін”. Можна будзе пагадаць на вянку, скупнуцца ды паскокаць праз вогнішча з Купалічам і Купалінкай. Падчас свята будуць абраныя самыя прыгожыя дзяўчына і хлопец. Пачнецца Купалле каля 22-й. Калі прыедзеце днём, зможаце папарыцца ў лазні ды прыгатаваць шашлыкі. Удзел у Купаллі бясплатны. З сабою Пушкін просіць захапіць хіба намёты ды па 0,5 літра мёду і спірту для агульнага крупніку. Даведкі па т.: (029) 606-82-06 (Алесь).

**Ганна Кот**

## КАНЦЭРТЫ

### Бартосік у Віцебску

Канцэрт барда Змітра Бартосіка адбудзецца **25 чэрвеня ў Музычнай гасцёўні Віцебска (вул. Фрунзэ, 11)**. **Пачатак у 18.30.** Даведкі праз т.: (029) 712-11-11, (029) 323-98-46.

### Гроднаджаз-2009

Упершыню міжнародны фестываль джаза пройдзе **ў Гродне 26 чэрвеня, пад дахам Новага замка**. Будзе гучаць як традыцыйны джаз, так і фанк, свінг, ф’южн. Удзельнічаюць калектывы Беларусі, Літвы і Польшчы.

### Камоцкі з найлепшымі песнямі

Прэзентацыя новага дыска «Песня як жыццё. Лепшае і невядомае» барда Алеся Камоцкага адбудзецца **29 чэрвеня ў тэатральнай зале Чырвонага касцёла**. **Пачатак у 18.30.** Уваход вольны.

### Жывы Гук On Line

**27 чэрвеня ў 17.00 у «Дворыку ЦДО» (калі абысці Дом афіцэраў справа і падняцца па высокіх сходах)** пройдзе першы канцэрт «Жывы Гук On Line» у новым фармаце і з бясплатным уваходам. На сцэну выйдзе 6 гуртоў: **GARADzKIJA**, **KROK**, **Hair Peace Salon**, **Open Space**, **MYTHAEBOKA**, **LIP**.

### Песні на словы Наталлі Арсенневай

**30 чэрвеня ў дольнай зале Чырвонага касцёла** пройдзе прэзентацыя дыска «З крывіцкай сям’і. Паэтычныя песні і рамансы» на вершы Наталлі Арсенневай. **Пачатак у 18.30.** Уваход вольны. Даведкі праз т.: (029) 649-08-88.



## ІМПРЭЗЫ

### Шагалаўскія дні

XIX Міжнародныя Шагалаўскія дні, у межах якіх — лекцыі, мастацкая выстава, грамадскае абмеркаванне праекта будучага Міжнароднага Шагалаўскага цэнтра ў Віцебску, пройдуць **у Віцебску 7 ліпеня**.

## ВЫСТАВЫ

### «Набліжэнне»

**Ад 20 мая да 20 чэрвеня кожны дзень, акрамя панядзелка, з 10.00 да 17.00 у Музеі Багдановіча (Багдановіча, 7а)** працуе выстава фатаграфіі Сяргея Борсука «Набліжэнне».

### «Новыя імёны»

Фотапраект «Новыя імёны» маладых фатографаў Моладзевай фотастудыі «Краявід» працуе **ў галерэі «Свет Фота» (Прытыцкага, 10) да 10 ліпеня**.

## ТЭАТРЫ

### 24 чэрвеня

**Музычны тэатр** — «Вясёлая ўдава»
**Тэатр оперы і балета** — «Дон Кіхот»
**Тэатр імя Горкага** — «Адзіны спадкаемца»
**Тэатр юнага гледача** — «Нататкі звар’яцелага музыкі»
**Тэатр-студыя кінаактора** — «Філумена Мартурана»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Чорны квадрат»
**Купалаўскі тэатр** — «Ядвіга»

### 25 чэрвеня

**Музычны тэатр** — «Капялюш Напалеона»
**Тэатр оперы і балета** — «Баядэрка»
**Тэатр юнага гледача** — «Апошняя дуэль»
**Тэатр-студыя кінаактора** — «...Забыць Герастрата!»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Сталіца Эраўнд»
**Купалаўскі тэатр** — «Ядвіга»

### 26 чэрвеня

**Музычны тэатр** — «Лятучая мыш»
**КЗ «Мінск»** — «Радзіна»
**Тэатр-студыя кінаактора** — «...Забыць Герастрата!»
**Купалаўскі тэатр** — «Паўлінка»

### 27 чэрвеня

**Музычны тэатр** — «Баядэра»
**Музычны тэатр** — «Бураціна.by»
**Тэатр оперы і балета** — «Яўгеній Анегін»
**Тэатр-студыя кінаактора** — «Механічны чалавек»
**Купалаўскі тэатр** — «Каханне ў стылі барока»
**Купалаўскі тэатр, малая сцэна** — «Гендэльбах»

### 28 чэрвеня

**«Тэатральны каўчэг»** — «Сублімацыя кахання»
**Музычны тэатр** — «Дон Жуан у Севільі»
**Музычны тэатр** — «Прыгоды брэменскіх музыкаў»
**Тэатр оперы і балета** — «Бахчысарайскі фантан»
**Тэатр-студыя кінаактора** — «Механічны чалавек»

### 29 чэрвеня

**Тэатр-студыя кінаактора** — «Майстар і Маргарыта»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Іванаў»
**Купалаўскі тэатр** — «Пінская шляхта»

### 30 чэрвеня

**Музычны тэатр** — «Рускі фантом»
**Тэатр оперы і балета** — «Карміна Бурана. Кармэн-сюіта»
**Тэатр-студыя кінаактора** — «Навечна ў памяці»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Жан і Беатрыса»
**Купалаўскі тэатр** — «Пінская шляхта»

## КІНО

### Рэшткі кінафармату

На гэтым тыдні ў мінскім кінатэатры «Цэнтральны» дэманструецца праграма аўтарскага кіно «Рэха Кінафармату». Стужка **«Масаі — ваяры дажджу» пройдзе 25 чэрвеня, у чацвер**. Гэта французская драма з афрыканскімі акторамі. Яе героі вандруюць па небяспечнай саване. **Пятнічная карціна «Уздых»** пастаўленая вядомым карэйскім майстрам Кім Кі Дукам. Аўтар прапануе правакацыйны любоўны шматкутнік з падманам і гвалтам.

Румынскі кінематограф, які цяпер на ўзлёце, прадстаўлены камедыяй **«12:08. На ўсход ад Бухарэста»**. У фільме героі вырашаюць звесці рахункі з сучаснасцю і з мінулым ды высветліць, ці дакацілася рэвалюцыя да іхняга гарадка. **Фільм прэзентуецца ў суботу.**

**Дзве драмы запланаваныя на нядзелю.** Герой аргентынскага фільма **«Перарваныя абдымкі»** Даніэля Бурмана спрабуе разабрацца ў сабе. А пранізлівая стужка **«Кантроль»** Антона Карбэйна распавядае пра апошнія гады жыцця загадкавага лідэра групы «Joy Division», які зрабіў сабе смерць.

Вянчае паказ **«Сукіякі Вестэрн Джанга»** фінскага эпатажніка Такашы Міике. Гэта дзіка-неахайная цытатная гульня ў вестэрн і гвалт (куды ж без яго Міике!) — з белымі шатамі, самурайскімі мячамі — і Квенцінам Таранцінам, які смажыць змяіныя яйкі. **Карціна дэманструецца ў суботу.**

**Андрэй Расінскі**

### «БЕЛСАТ»: ТЭЛЕПРАГРАМА НА 29 ЧЭРВЕНЯ—5 ЛІПЕНЯ

# «Белсат» — гэта незалежны беларускі спадарожнікавы тэлеканал

### 29 чэрвеня, панядзелак

**18.00** Аб'ектыў (агляд падзей дня)
**18.05** «Элі Макбіл», тэлесерыял: V сезон, 7 серыя
**18.50** «Кіно і катлеты», дак. фільм, рэж. Вольга Мікалайчык, 2008 г., Беларусь
**20.05** Прэс-экспрэс (агляд медыяў)
**20.20** Еўрапейскі Саюз без сакрэтаў, 2 серыя: «Сельскагаспадарчая палітыка»
**20.40** Асабісты капітал (эканамічная праграма)
**21.00** Аб'ектыў (галоўны выпуск)
**21.20** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Курганы» (спазнаваўчая праграма)
**21.25** «Чалавечая прырода», маст. фільм, рэж. Мішэль Гандры, 2001 г., ЗША.
**23.05** «НКВД — гестапа. Браты па крыві», дак. фільм, рэж. Уладзімір Самойлаў, 2009 г., Беларусь
**23.40** Аб'ектыў

### 30 чэрвеня, аўторак

**18.00** Аб'ектыў (агляд падзей дня)
**18.05** «Вышэй за падазрэнні», маст. фільм, рэж. Стывен Ла Рок, 2000 г., ЗША.
*Галоўнага героя Джэймса Стоктана — выдатнага сем'яніна — вельмі паважаюць у горадзе. Аднойчы, калі Джэймс вярнуўся са службовай паездкі, жонка знайшла ў яго рэчах фота нейкай дзяўчыны. Джэймс сцвярджае, што на здымку — былая сяброўка, якая памерла 14 гадоў таму. Але паступова выяўляецца, што ўсё не так проста...*
**19.45** Хто ёсць кім: «Бард і літаратар Міхаіл Валодзін. Тут мой дом»
**20.10** Акно ў Еўропу (інфармацыйная праграма)
**20.40** Беларусы ў Польшчы
**21.00** Аб'ектыў (галоўны выпуск)
**21.20** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Хрысціянства» (спазнаваўчая праграма)
**21.25** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Заўчасны падарунак», дак. фільм, рэж. Яраслаў Каменьскі, 1996 г., Польшча
**22.20** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял: 13 серыя
**23.10** Еўропа сёння (тэлечасопіс канала «Нямецкая хваля»)
**23.40** Аб'ектыў

### 1 ліпеня, серада

**18.00** Аб'ектыў (агляд падзей дня)
**18.05** «Ранча», серыял: 38 серыя
**18.50** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял: 13 серыя
**19.45** Невядомая Беларусь: «Распавяду вам пра сябе», дак. фільм, рэж. Сяргей Ісакаў, 2009 г., Беларусь
**20.30** Праект «Будучыня» (навукова-папулярны тэлечасопіс канала «Нямецкая хваля»)
**21.00** Аб'ектыў (галоўны выпуск)
**21.20** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Міндоўг» (спазнаваўчая праграма)
**21.30** «Вышэй за падазрэнні», маст. фільм, рэж. Стывен Ла Рок, 2000 г., ЗША.
**23.10** Госць «Белсата»: Павал Мажэйка размаўляе з вядомымі экспертамі ды палітыкамі на найбольш актуальныя і гарачыя тэмы
**23.25** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма)
**23.40** Аб'ектыў

### 2 ліпеня, чацвер

**18.00** Аб'ектыў (агляд падзей дня)
**18.05** «Ранча», серыял: 39 серыя
**18.55** «Апошні сезон», серыял: 9 серыя
**19.50** «Праваслаўныя дзеячы», дак. фільм, рэж. Мікалай Ваўранюк, 2008 г., Польшча
**20.05** YoLife! (моладзевая праграма)
**20.30** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс канала «Нямецкая хваля»)
**21.00** Аб'ектыў (галоўны выпуск)
**21.20** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Хрысціянства» (спазнаваўчая праграма)
**21.30** Дакументальная гадзіна: «Нармальнае жыццё», дак. фільм, рэж. Чаі Вашархэі і Г'юга Бэрклі, 2003 г., ЗША
**22.35** МакраФон: «Be Free–2008», фестываль, ч. 2: выступ гурта «Neuro Dubel»
**23.05** Еўрапейскі Саюз без сакрэтаў, 2 серыя: «Сельскагаспадарчая палітыка»
**23.25** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма)
**23.40** Аб'ектыў

### 3 ліпеня, пятніца

**18.00** Аб'ектыў (агляд падзей дня)
**18.05** «Ранча», серыял: 40 серыя
**18.55** Праект «Будучыня» (навукова-папулярны тэлечасопіс канала «Нямецкая хваля»)
**19.25** Форум (ток-шоу): Каму служыць беларускі чыноўнік
**20.15** «400-годдзе князя Канстанціна Астрожскага», 2008 г., Польшча
*Рэпартаж з урачыстасці.*
*Род князёў Астрожскіх быў адным з найбуйнейшых родаў ВКЛ. Ён даў славутых дзяржаўных дзеячаў, гетманаў, святароў. Вялікі гетман літоўскі Канстанцін Астрожскі ў 1514 г. кіраваў войскам ВКЛ у пераможнай Аршанскай бітве з маскоўскім войскам. Ягоны сын, князь Канстанцін Астрожскі (1526—1608), на сваіх землях збудаваў больш за 600 цэркваў і 20 манастыроў, падтрымліваў школы, створаныя пры брацтвах. Адной з самых вядомых князевых справаў стала адкрыццё славутай Астрожскай акадэміі. З друкарні пры Акадэміі ў 1581 г. выйшла Астрожская Біблія — першае поўнае выданне Бібліі на царкоўнаславянскай мове, адна з найважнейшых духоўных кніг усходняга хрысціянства і славянскага свету.*
**20.40** Госць «Белсата»: Павал Мажэйка размаўляе з вядомымі экспертамі ды палітыкамі на найбольш актуальныя і гарачыя тэмы
**21.00** Аб'ектыў (галоўны выпуск)
**21.20** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Міндоўг» (спазнаваўчая праграма)
**21.30** «Happy New York», маст. фільм, рэж. Януш Заворскі, 1997 г., Польшча
**23.10** Жаўтуха (сатырычная праграма)
**23.40** Аб'ектыў

### 4 ліпеня, субота

**18.00** Аб'ектыў (агляд падзей дня)
**18.05** «Савецкая гісторыя», дак. фільм, рэж. Эдвінс Шнорэ, 2008 г., Вялікабрытанія
*Стужка латвійскага рэжысёра распавядае пра злачынствы савецкага рэжыму: Галадамор ва Украіне, Катынскае забойства, цесная супраца НКВД і гестапа ў 1939—1941 гг., масавыя дэпартацыі пасля Другой сусветнай вайны, медычныя эксперыменты на зняволеных ГУЛАГа ды інш. У фільме, праца над якім працягвалася больш за дзесяць гадоў, выкарыстоўваюцца як архіўныя матэрыялы, так і інтэрв'ю ахвяр ды аповеды гісторыкаў.*
**19.35** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс канала «Нямецкая хваля»)
**20.00** YoLife! (моладзевая праграма)
**20.20** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Кнопка», дак. фільм, рэж. Яраслаў Каменьскі, 1994 г., Польшча
**21.00** Аб'ектыў (галоўны выпуск)
**21.15** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Курганы» (спазнаваўчая праграма)
**21.20** Еўропа сёння (тэлечасопіс канала «Нямецкая хваля»)
**21.50** Чалавек-эпоха: «Маці зняволеных», дак. фільм, рэж. Піна Катальда, Мікеле Шанкалепорэ, 2005 г., Італія
**22.50** «Апошні сезон», серыял: 10 серыя
**23.40** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма)
**23.50** Аб'ектыў




### 5 ліпеня, нядзеля

**18.00** Прэс-экспрэс (агляд медыяў)
**18.15** «Элі Макбіл», тэлесерыял: V сезон, 8 серыя
**19.00** МакраФон: «Рок па вакацыях–2008», ч. 1
**19.50** Форум (ток-шоу): Чаму маладыя людзі эмігруюць?
**20.40** Хто ёсць кім: Сяржук Вітушка (публіцыстычная праграма)
**21.00** Аб'ектыў (вынікі тыдня)
**21.20** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Гедымін» (спазнаваўчая праграма)
**21.25** Акно ў Еўропу (інфармацыйная праграма)
**21.55** Фільматэка майстроў: «Увага, дзверы зачыняюцца», маст. фільм, рэж. Пітэр Гоўіт, 1998 г., Вялікабрытанія — ЗША.
*Гелен спускаецца ў метро, каб сесці ў цягнік, але раптам вырашае вярнуцца дадому, дзе застае свайго хлопца ў ложку з іншаю жанчынаю. Лёс прапаноўвае ёй іншы варыянт: усё ж сесці ў цягнік і сустрэць там мужчыну, які стане каханнем ейнага жыцця. Гледачу прапаноўваецца паралельна сачыць за развіццём абодвух сюжэтаў...*
**23.30** «Бульбаны», мультсерыял
**23.40** Аб'ектыў

# Еўропа вучыць Беларусь змагацца з наркотыкамі

**Еўрапейскі саюз і Праграма развіцця ААН рэалізуе ў Беларусі праект «Беларуска-ўкраінска-малдаўская праграма па барацьбе з незаконным абаротам і гандлем наркатычнымі рэчывамі» (БУМАД).**

Вялікай праблемай сёння з'яўляецца ўжыванне наркотыкаў падлеткамі. Вельмі складана дастукацца да ўсіх бацькоў у нашай краіне, каб расказаць ім пра метады барацьбы і прафілактыкі ўжывання наркотыкаў. Але людзі, што рэалізуюць праект БУМАД, знайшлі спосаб.

— Праз настаўнікаў у школах! — расказвае Ганна Чарнышова, каардынатар праектаў Праграмы развіцця ААН у Беларусі.

На семінарах для настаўнікаў, якія праводзіліся ў межах праекту ў Мінску і абласцях, былі проста аншлагі! На інтэнсіўных курсах еўрапейскія трэнеры расказвалі, як вызначыць, у каго з вучняў ёсць схільнасць да таго, каб паспрабаваць наркотыкі, давалі спецыяльную дапамогу.

Планы найлепшых урокаў па прафілактыцы наркотыкаў надрукавалі ў спецыялізаванай газеце для настаўнікаў. У выніку нават тыя выкладчыкі, што не змаглі паўдзельнічаць у семінарах, атрымалі інфармацыю.

Апроч таго, настаўнікам раздалі брашуры «Штодзённік клапатлівых бацькоў». А настаўнікі, у сваю чаргу, перадалі іх бацькам сваіх вучняў.

У 2003 г., калі пачыналася праграма, тэхнічная ўкамплектаванасць праваахоўных органаў была слабая. Таму сродкі, выдзеленыя Еўракамісіяй, пайшлі на камплектацыю. Для мытні купілі 500 камплектаў экспрэс-тэстаў на наркотыкі, лазерныя далевымяральнікі для грунтоўнага дагляду грузавых машын. Для падраздзялення па наркакантролі МУС набылі аўтамабіль, падзорныя трубы, дыктафоны, фотакамеры, ноўтбукі і камп'ютары. А для кінолагаў закупілі спецыяльна навучаных сабак. І менавіта адзін з «БУМАДаўскіх» сабак дапамог затрымаць буйную партыю наркотыкаў!

«На жаль, у праграмы ёсць і няўдачы, — расказала Ганна Чарнышова. — Мы не змаглі правесці даследаванне па ўжыванні наркотыкаў сярод школьнікаў». Такія даследаванні кожныя два гады праводзяцца ў Еўропе, пачынаючы з 1980 г. Яны дазваляюць вызначыць, у якім узросце падлеткі пачынаюць ужываць наркотыкі, дзе бяруць... Міністэрства адукацыі палічыла, што пералік відаў наркотыкаў у пытанні анкеты: «Якія з гэтых наркотыкаў вы ведаеце?» можа выклікаць у школьнікаў жаданне іх паспрабаваць.

Яшчэ адно дасягненне праграмы — стварэнне нацыянальнага цэнтра маніторынгу наркотыкаў. Цэнтр створаны на базе Гродзенскага медуніверсітэта. Ён збірае ўсю інфармацыю пра наркотыкі, якая датычыць статыстыкі, смяротнасці.

З'явіўся доступ да міжнароднага досведу. Раней накіроўваць спецыялістаў у Германію, Італію і іншыя еўрапейскія краіны для нашых ведамстваў было складанай справай. Дзякуючы праграме, гэта стала магчымым. Цяпер у краіне ёсць людзі, што сталі носьбітамі ведаў пра тое, як змагаюцца з наркотыкамі ў Еўропе.

**Сімптомы, якія могуць сведчыць пра тое, што падлетак ужывае наркотыкі:**

- бледнасць і пачырваненне скуры
- пашыраныя ці звужаныя зрэнкі, пачырванелыя ці памутнелыя вочы
- няўцямнае, запаволенае або паскоранае маўленне
- страта апетыту, схуднеласць ці празмернае ўжыванне ежы
- кепская каардынацыя рухаў (пахістванне ці спатыканне)
- дрыжыкі
- абыякавасць да асабістай гігіены і свайго выгляду
- кругі пад вачыма
- беспрычыннае ўзбуджэнне
- вяласць
- змяненне настрою, узбуджальнасць, раздражнёнасць, варожасць
- бяссонніца і снуласць
- сыходы з дому, прапусканне школы з незразумелых прычынаў
- імкненне ўнікнуць стасункаў з блізкімі сябрамі ці людзьмі, якія могуць пацікавіцца прычынамі зменаў у паводзінах
- хваравітая рэакцыя на крытыку, частыя і рэзкія змены настрою
- зніжэнне паспяховасці ў школе
- пастаянныя просьбы даць грошай
- знікненне з дому каштоўнасцяў
- частыя тэлефонныя званкі, выкарыстанне жаргону, сакрэтныя размовы
- самаізаляцыя, няўдзел у справах, якія раней былі цікавыя
- унікненне адказаў на наўпростыя пытанні, схільнасць маніць, выкручвацца
- неахайны выгляд

Рабіце правільныя высновы і майце на ўвазе, што ўсе гэтыя прыкметы могуць быць выкліканыя абсалютна іншымі прычынамі!

# Мінск—Багдад: знайдзі дзесяць адрозненняў





**Лос-анжэлескі мастак Сандаў Бірк стварыў карціну, дужа падобную на вядомую кожнаму беларусу працу Валянціна Волкава.**

Дадаўшы трохі ўсходняга каларыту, перарабіўшы савецкіх салдатаў на амерыканскіх, а мінчукоў — на багдадцаў, дамаляваўшы на руінах графіці з Мікі Маўсам, Сандаў Бірк назваў свой манументальны твор «Вызваленне Багдада».

Бірк вядомы як постмадэрніст-рымейкер. Большасць яго рэалістычных прац прысвечаныя сучаснаму жыццю: сацыяльная несправядлівасць, вулічны гвалт, турэмнае жыццё. Але натхненне ён чэрпае з карцін мінулых стагоддзяў: батальных сцэн і партрэтаў класічных мастакоў. Напрыклад, на стварэнне серыі прац пра сучасныя войны «Заганы вайны» яго натхнілі гравюры XVII стагоддзя «Пакуты вайны», аўтарства Жака Кало.

І вось яго правакацыйны пэндзаль дабраўся да беларускай тэматыкі.

«Я знайшоў працу Волкава ў кнізе пра савецкае рэалістычнае мастацтва ў лос-анжэлескай бібліятэцы, — распавёў Сандаў Бірк карэспандэнту «НН». — Я не ведаю назвы гэтай карціны ні па-расейску, ні па-беларуску, але праца мне вельмі спадабалася. Яна зробленая ў выразным прапагандысцкім стылі, яна велічная, напоўненая рамантычнымі вобразамі. Да таго ж, мае складаную і вытанчаную кампазіцыю: з усмешлівым салдатам пасярэдзіне, які ўзняў вінтоўку. Гэта класічная трохкутная кампазіцыя».

Мастак кажа, што хацеў выкарыстаць прапагандысцкі стыль савецкага жывапісу, дзе ўсе выяўленыя людзі шчасліва ўсміхаюцца, каб даць сваю сатырычную перспектыву на вайну ў Іраку. «Мая карціна — увасабленне таго, што абяцаў амерыканскаму народу Джордж Буш, калі нашае войска ўварвецца ў Ірак. Калі людзі на маіх выставах бачаць «Вызваленне Багдада», дык смяюцца, бо гэта яскрава сатырычны твор».

На пытанне, ці быў Бірк у Беларусі, мастак адказаў, што найбліжэйшы да нас пункт, дзе яму давялося пабываць, — гэта Берлін. «Але ў сваіх працах я часта выкарыстоўваю напрацоўкі савецкіх мастакоў, — кажа Бірк. — Мне падабаецца, калі ёсць сувязь паміж зместам старой карціны і ідэяй, якую я жадаю перадаць у маім малюнку».

**Павал Касцюкевіч**

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ВІТАННІ

**Віншуем Вераніку Дзядок і Сяргея Харэўскага** з хростам дачкі Евы-Дамінікі. Няхай расце здаровая, пад апекаю мудрых хрышчоных бацькоў. Калегі

**Віншую Кастуся Капелюша** з паступленнем у ліцэй БДУ і пераездам у Мінск! Зычу поспехаў у навучанні! Ташырскі

**Віншуем рэжысёра Валерыя Раеўскага** з 70-годдзем. Вы стварылі цэлую традыцыю, Вы жывая памяць беларускага тэатра. «Забіць Дракона», «Мудрамер», «Гаральд і Мод», «Тутэйшыя», «Ідылія» — гэта ўсё сталася пры Вас. Дай Вам Бог добрага здароўя і новых адкрыццяў! Тэатралы

### КВАТЭРА

**Здам двухпакаёўку** ў цэнтры. Пасля рамонту. Тэл. (029) 162-46-12

### АРШАНСКАЯБІТВА

**Працягваецца падрыхтоўка** да традыцыйнага фэсту беларускай аўтарскай песні і паэзіі «Аршанская Бітва». Запрашаем беларускіх выканаўцаў да ўдзелу ў народным свяце. Для інфармацыі: vorsafest.livejournal.com. Сувязь: vorsha2009@gmail.com

## ЖАРТЫ

* * *

Шукаю працу ў офісе. Падчас праверкі магу з'есці любую дакументацыю.

* * *

Даішнік:

— Вашы дакументы, сэр!

— Чаму гэта я раптам сэр?!

— Бо едзеце па левым баку дарогі!

* * *

Хлопчык з вадзяным пісталетам месяц трымаў у страху карбідны завод.

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

У вёсца Немеж адна жонка кінула мужа, бо ён часта яе б'е. Прыехаў старшыня рудомiскі Язэп Шчагло і замест таго, каб памірыць, сказаў мужу, каб ён смела біў. Дык гэты мужык, Іван Беляш, узрадаваўся і прыбіў цешчу, так што яна цяпер ляжыць слабая, і жонку збіў таксама. Дык жонка ўжо зусім уцякла ад такога добрага мужа.

**«Наша Ніва». №24. 1909**

Шаноўныя чытачы, наступны нумар «НН» выйдзе **8 ліпеня**. Будзьце асцярожныя ля купальскага вогнішча!

**Наша Ніва**

незалежная газета

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

| | |
|---|---|
| сакратарка рэдакцыі | Наста Бакшанская |
| шэф-рэдактар | Андрэй Дынько |
| галоўны рэдактар | Андрэй Генадзевіч Скурко |
| мастацкі рэдактар | Сяргей Харэўскі |
| заснавальнік | Мясцовы фонд выдання газеты «Наша Ніва» |
| выдавец | Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы» |

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Мінск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.

12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных абвестак. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №581 ад 14 сакавіка 2007 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Мінск, пр. Ракасоўскага, 102-71. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Мінск, код 764.

Наклад 6015. Газета выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 23.00 23.06.2009.
Замова № 3382.
Рэдакцыйны адрас: Ракасоўскага, 102-71.
Цана дамоўная.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
ISSN 1819-1614
9 771819 161008 09024